№ 33 (583) 4 верасьня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



## Фэномэн БАТЭ

Галоўны трэнер каманды Віктар Ганчарэнка ў Рэдакцыі «НН».

Старонка 8

## Голы японец у цэнтры Менску

Рэпартаж Паўла Касьцюкевіча.

Старонка 6

## Цуды ў Лучаі

Тутэйшы касьцёл сваім гмахам, дасканалай архітэктураю й убраньнем пераўзыходзіць сотні іншых храмаў.

Старонка 11

# Адны верацЬ, другія — не

Баршчэўскі выступае за зьняцьцё кандыдатаў, Саньнікаў — за байкот, Лябедзька і Калякін — за ўдзел.




Перад паседжаньнем АДС дзьверы сядзібы БНФ, дзе яно праходзіла, расьпісалі.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Дапусьцім, што палітычная лёгіка сыстэмы не памянялася. Што тады здарыцца 28 верасьня? На самых чэсных выбарах у Палату ня трапіць ніводзін кандыдат са сьпісу АДС — народ не падтрымае. Захад закапыліць губу і прызнае выбары толькі часткова. Лукашэнка «пакрыўдзіцца» і прызнае незалежнасьць асэтынскіх аулаў узамен за падпісаньне новага газавага пагадненьня з Масквой. Апазыцыя застанецца пры разьбітым карыце.

Дапусьцім, што лёгіка памянялася. Сыстэма пачынае дзейнічаць па мэтадзе Аліева. Прапускае пару ціхіх апазыцыяністаў у палату і пераходзіць з рангу свайго для Расеі, чужога для Захаду ў ранг свайго чужога для Захаду і Расеі.

Што здарыцца 28-га? Лідэры апазыцыйных партый па-рознаму адчытваюць сыгналы ўладаў і ставяць на розныя тактыкі.

Участковыя камісіі не зарэгістравалі 20 кандыдатаў са сьпісу Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Не зарэгістраваныя і Мікола Статкевіч, Аляксандар Макаеў.

Увогуле, па выніках працы акруговых камісій 84 прэтэндэнтам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў было адмоўлена ў рэгістрацыі. Гэта 23% ад агульнай колькасьці тых, хто падаў дакумэнты на рэгістрацыю.

Галоўнай прычынай адмоваў зьяўляюцца нібыта няправільна сабраныя подпісы (напрыклад, няправільна прастаўленыя даты). Другая прычына — няправільна запоўненыя дэкларацыя. Хаця тут, як прызналася ў пятніцу на прэс-канфэрэнцыі Лідзія Ярмошына, акруговыя камісіі дзейнічалі «занадта строга». Яна прывяла прыклад аднаго з кандыдатаў, якому ў правіну паставілі незадэклараваны матацыкл, які даўно згарэў (маецца на ўвазе камуніст Аляксандар Апанасюк з Століна). Гэта не зашкодзіла ЦВК такі адмовіць у сераду Апанасюку ў ягонай скарзе.

Шэсьць чалавек добраахвотна зьняліся з дыстанцыі, у тым ліку дэпутаты Палаты сёньняшняга скліканьня — Сяргей Касьцян, Анатоль Красуцкі, Мікалай Чурсін, Сяргей Камянецкі. Некаторыя зь іх захаваюць на суцяшэньне дзяржаўныя пасады і службовыя кватэры. Увогуле ж, у выбарах будуць удзельнічаць 37 былых дэпутатаў. Такім чынам, склад Палаты падновіцца мацней, чым у мінулы раз.

Ніводная апазыцыйная партыя на этапе рэгістрацыі не абышлася бяз стратаў. Найбольш адчувальныя панесьлі ПКБ і БНФ. Акруговыя выбарчыя камісіі не зарэгістравалі па пяць чалавек ад гэтых арганізацый.

Зьвяртае на сябе ўвагу адмова ў рэгістрацыі двум намесьнікам старшыні партыі БНФ — Вінцуку Вячорку і Віктару Івашкевічу. Абодвум палітыкам адмоўлена з прычыны «несапраўднасьці больш чым 20% сабраных подпісаў». «Са мной па гэтым пытаньні не кансультаваліся», — кажа старшыня ЦВК.

В.Івашкевіч меўся ісьці на выбары па Кастрычніцкай акрузе Менску, В.Вячорка — у Зялёным Лузе. Па Кастрычніцкай акрузе затое зарэгістравалі намесьніка Гайдукевіча, а ў Вячоркавай — Віктара Кавальчука, былога сябра Партыі БНФ.

Працяг на старонцы 5.

## СЬЦІСЛА

### Тэстастэрон зашкаліў

Міжнародны алімпійскі камітэт у найбліжэйшы час абвесьціць пра дзьве станоўчыя допінг-спробы, атрыманыя на алімпійскім турніры ў Пэкіне.

Забаронены прэпарат тэстастэрон знайшлі ў беларускіх кідальнікаў молату, прызёраў гульняў Вадзіма Дзевятоўскага і Івана Ціхана, паведамляе Прэссбол.

Нагадаем, што на Алімпіядзе Дзевятоўскі заваяваў срэбра, а Ціхан — бронзу.

Допінг-спробы былі ўзятыя пасьля фіналу 17 жніўня, і паказалі выкарыстаньне забароненага тэстастэрону ў выглядзе мазяў ці геляў.

Дзевятоўскі ў 2000—2002 ужо адбываў дыскваліфікацыю за выкарыстаньне забароненых прэпаратаў, таму цяпер яму пагражае пажыцьцёвая.

АГ

### Перадзел улады ва Ўкраіне

Фракцыя Юліі Цімашэнкі, Партыя Рэгіёнаў Януковіча і камуністы аб'ядналіся, каб абмежаваць паўнамоцтвы прэзыдэнта Юшчанкі. Вярхоўная Рада прыняла шэраг заканадаўчых актаў, якія выводзяць Службу бясьпекі Ўкраіны і кабінэт міністраў з-пад кантролю прэзыдэнтуры, і заблякавала праект заявы ў падтрымку Грузіі, якую прапанавала прапрэзыдэнцкая фракцыя. Супрацоўнікі прэзыдэнтуры тым часам абвінавацілі Юлію Цімашэнку ў патаемнай змове з Масквой з мэтай атрымаць палітычную падтрымку Расеі на выбарах 2010 г.

Мікола Бугай

### «НН» і «ARCHE» ў Смалявічах

**11 верасьня (чацьвер) а 19.00 у Смалявічах** адбудзецца сустрэча рэдактараў «Нашай Нівы» і «ARCHE» з чытачамі. Прыедуць Валер Булгакаў і Андрэй Дынько. Даведкі праз тэл. 117-98-33, 571-86-88 (Яўген).

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

## Мы дзялілі часткі сушы

Мы дзялілі часткі сушы.
Гэту частку — Джорджу Бушу.

Гэту частку пакідаем
Трэцім рымлянам з Кітаем.

(Што ня так? Правы Тыбэту?
Ты б яшчэ згадаў кабету!)

Гэту частку — Эўразьвязу...
Пачакай — ня ўсё адразу —

Хопіць немцам, скандынавам...
Курдыстан? А на храна вам?

Гэтую табе, араб,
У Ізраіля пара б!

Што, наадварот — габрэям?
Памыляемся. Старэем.

Хто шкадуе Індастану?
Кама-сутрай іх дастану!

Для брытанцаў, для ірляндцаў
А паўночным? Тут бяз шанцаў.

Афрыканцам. Аўстралійцам.
І крыху — каўказскім ліцам.

Ружаў — ружжаў? — для грузінаў.
Украінцам — апэльсінаў.

— Ці ня мала Беларусі?
— Я і гэтым ганаруся!

Ёсьць для рэзэрвацый нешта
І пінгвінам — уся рэшта.

А для Атлянтыды — дно.
Ёй даўно — усё адно.

# «НН»-тэлевізія: 100 тысячаў праглядаў!




10 студзеня 2008 году наведнікі nn.by заўважылі незвычайную цікавостку: на сайце зьявілася першае відэа. Здаецца, ня так і шмат часу прайшло з таго дня, але прагрэс відавочны. На гэтым тыдні лічба наведваньняў нашага інтэрнэт-відэаканалу перавысіла 100 000! Самае папулярнае відэа, зьнятае падчас сэнсацыйнага выхаду Аляксандра Казуліна на волю для пахаваньня жонкі Ірыны, праглядзелі амаль 15 000 разоў.

Насамрэч, стварыць відэа нейманверна цікава і ня так ужо і складана, як можа здацца: галоўнае пачаць. У абноўленым сайце «НН» рубрыка інтэрнэт-відэа заняла пачэснае месца ў самым версе галоўнай старонкі.

На сайце «НН» можна пабачыць і гарачыя рэпартажы зь мітынгаў (дарэчы, гэтае шакуючае відэа паказаў нават тэлеканал Аль-Джазіра ў сваім рэпартажы пра Беларусь), і па-мастацку прыгожыя рэпартажы нашай відэакарэспандэнткі Тацяны Гаўрыльчык з агнявога шоў ці з Купальля ў Строчыцах. Мы выпраўляемся ў вандроўкі разам з таленавітымі фотажурналістамі «НН» і пішам агульнанацыянальную дыктоўку разам зь легендарнай дыктаркай Зінаідай Бандарэнкай. Відэа «НН» можна глядзець нават па-ангельску.

Пакрысе мы пачынаем ствараць уласныя відэапраграмы. Надоечы распачаў сваю працу відэаблог кінакрытыка Андрэя Расінскага «Кадры», дзе можна будзе азнаёміцца з апошнімі навінкамі кінапракату.

Мы ня толькі выстаўляем у сеціва ўласныя відэаматэрыялы, але і шукаем у інтэрнэце цікавыя сюжэты іншых аўтараў ды выстаўляем на сайт, даючы пляцоўку для выказваньня і буйным тэлеканалам, і блогерам, і нават таленавітым школьнікам, якія зьнялі фільм пра родны горад.

Відэа сайту «НН» перастаўляюць на сваіх старонках і найбуйнейшы беларускі партал TUT.by, і «Хартыя'97» і «Беларускі партызан», і шматлікія ўладальнікі інтэрнэт-дзёньнікаў. Абменьваючыся спасылкамі на відэа ў сеціве, мы разам ствараем адзін вялікі тэлеканал свабоды.

Інтэрнэт-відэа надзіва дэмакратычнае. Яго можна глядзець калі заўгодна і задарма (каштуе толькі інтэрнэт-трафік), без навязлівай рэкламы. Інтэрнэт-відэа можна стварыць і самому — дастаткова захацець і прыкласьці крыху намаганьняў. У наш час ня трэба мець дарагога абсталяваньня для таго, каб зрабіць відэакарэспандэнтам ці займець славу папулярнага відэаблогера. Здымаць відэа можна і на мабільны тэлефон, і на лічбавы фотаапарат. Выкладайце сваё відэа ў інтэрнэт, дасылайце нам спасылкі, і мы будзем разам ствараць сваю інтэрнэт-тэлевізію!

Глядзець відэа «НН» можна наўпрост на YouTube, у асобным разьдзеле «НН» на відэапартале belarus-live.tv, але найлепей — на сайце «НН», з тэкстам, фота, і камэнтарамі — нашымі ды вашымі.

**Алесь Бондар**

## Лідэра апазыцыі Інгушэціі застрэлілі

ў прысутнасьці «прэзыдэнта» гэтай тэрыторыі.

Магамед Еўлоеў прыляцеў у Магас, сталіцу аўтаноміі, адным рэйсам зь яе «прэзыдэнтам», генэралам ФСБ Муратам Зязікавым. У аэрапорце Зязікава сустрэў картэж, а Еўлоева — група спэцназаўцаў. У часе затрыманьня распачалася страляніна, і Еўлоеў загінуў. Паводле афіцыйнае вэрсіі, спэцназаўцы адкрылі папераджальную стральбу па нагах, але выпадкова куля трапіла ў галаву.

Забіты быў уласьнікам сайту Ингушетия.ру і нефармальным лідэрам апазыцыі, што патрабуе больш павагі да мясцовых традыцый і правоў чалавека. Сайт быў забаронены, нібыта за экстрэмізм, а яго рэдактарка Роза Мальсагава вымушаная была прасіць прытулку ў Францыі.

Інгушэція — адна з найбяднейшых тэрыторый Расеі. Перанаселеная, занядбаная, гістарычна пакрыўджаная — у часе этнічнай чысткі 1944 году частку інгускіх зямель аддалі палітычна адданым Расеі асэтынам — тэрыторыя ўяўляе сабою выбуховы кацёл.

**Мікола Бугай**




**Фундамэнтальная «Анталёгія беларускага перакладу»**
**Выйшла «Анталёгія беларускага перакладу» — такая самая, як калісьці «Анталёгія беларускае паэзіі». Укладальнік Міхась Скобла, матор праекту Аляксандар Фядута. Калі выхаду тае першае паспрыяў у свой час Павал Якубовіч, дзеля выхаду другой папрацавалі ўжо іншыя дабрадзеі.**

РЭАКЦЫІ

## У чым інтэрпрэтацыя, спадар Калякін?

На пасяджэньні Палітрады АДС у нядзелю сярод іншых тэмаў абмяркоўваліся словы лідэра Партыі камуністаў Беларускай Сяргея Калякіна ў інтэрвію «НН».

Нагадаем, што палітык ухваліў прызнаньне Расеяй незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі: «Абхазія і Асэтыя нічым ня горшыя за касаўскіх альбанцаў. Калі ўвесь сьвет прызнаў незалежнасьць Косава, то чаму ня можа зрабіць гэта ў дачыненьні да гэтых дзяржаваў? Народы Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі выказалі волю жыць у незалежных дзяржавах. Што тут можа быць кепскага? Прызнаньне незалежнасьці ня толькі магчымае, але і неабходнае. Беларусь таксама павінна прызнаць волю гэтых народаў». Ён таксама заявіў: «Ні для кога не сакрэт, што і нашая краіна набыла незалежнасьць таксама досыць дзіўным чынам, калі тры чалавекі ў Белавескай пушчы падпісалі дамову аб развале СССР. Міжнародная супольнасьць тады хуценька прызнала Беларусь як асобную дзяржаву. Таму, думаю, падобнае можа паўтарыцца і зараз».

Калякін заявіў, што ягоныя словы былі няправільна інтэрпрэтаваныя журналістамі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Як перадае «Хартыя-97», з ініцыятывай асудзіць дадзеныя заявы лідэра камуністаў выступіла Партыя БНФ. А лідэр аргкамітэту па стварэньні партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя Павал Севярынец заявіў аб неабходнасьці выключэньня Калякіна і ягонай партыі з складу Дэмакратычных сілаў. Аднак Калякін заявіў, што ягоныя словы нібы былі няправільна інтэрпрэтаваныя журналістамі, і пытаньне было зьнятае з працы дня.

У чым інтэрпрэтацыя, спадару Калякін? Цытату мы падалі даслоўна, з Вашых словаў, бязь нейкіх аўтарскіх камэнтароў.

Параўнайце з тым, што сп.Калякін у той жа дзень заявіў практычна тое самае ў тых самых словах у інтэрвію «Нямецкай хвалі»: «...Россия последовательно поступает, признав волю народов на независимость. Я считаю, что это вполне адекватный шаг, и другие страны тоже признают независимость этих территорий, а какие-то страны не признают. ... Я считаю, что Беларусь должна признать независимость Абхазии и Южной Осетии».

Натуральна, чытачы і нават палітычныя саюзьнікі адчыталі гэтыя заявы як спробы спадабацца Маскве. Усё мае сваю цану.

**Рэд.**

## За 16 гадоў у Расеі быў асуджаны кожны дзясяты

У Расеі за 16 гадоў за крымінальныя злачынствы былі асуджаныя звыш 15 млн чалавек.

Такія зьвесткі прывёў экс-судзьдзя Вярхоўнага суду, кіраўнік цэнтру Інстытуту заканадаўства і параўнальнага праваназнаўства пры ўрадзе РФ Уладзімер Радчанка. Паводле яго, пяць мільёнаў зь іх былі асуджаныя да рэальнага пакараньня.

Прычым сярэдняя колькасьць асуджаных у год у пэрыяд з 1992 па 2007 гады вырасла ўдвая ў параўнаньні з пэрыядам 1987—1992 гадоў.

**«Эхо Москвы»**

## Дарафеева падарыла Лукашэнку песьню



У Сочы гэтымі днямі праходзіў конкурс маладых выканаўцаў «Пяць зорак», у якім бяруць удзел прадстаўнікі постсавецкіх краінаў.

Апроч таго, адбываліся розныя канцэртныя праграмы. Прыкладам, у нядзелю па тэлебачаньні паказалі выступ беларускіх зорак: як тых, хто жыве ў Менску, так і тых, хт жыве ў Маскве.

Канцэрт у ноч з 29 на 30 жніўня быў прысьвечаны дню нараджэньня Аляксандра Лукашэнкі. Яго распачала песьня «Страна бульбаша — моя Бела Раша», супольна выкананая ўсімі ўдзельнікамі. А заслужаная артыстка Ірына Дарафеева выйшла на сцэну ў зялёнай сукенцы й падарыла Аляксандру Лукашэнку песьню «Ангел мой несравненный, неземной и нереальный». Глядзелася гэта двухсэнсоўна, бо перад тым вядоўца пажартаваў на тэму курортных раманаў: «Если женщина идет в красном платье, то ее нельзя, если в зеленом — можно, а если в желтом, то скоро будет можно».

Тым часам папулярная ў Расеі беларуская сьпявачка Натальля Падольская скончыла свой выступ словамі «Няхай жыве Беларусь» (па-беларуску), што было прыхільна сустрэта расейскай публікай.

**БТ**

У апагей супрацьстаяньня паміж Расеяй і Захадам Менск пастаўлены перад жорсткім выбарам — з кім ён. Звычайная палітыка лявіраваньня паміж двума геапалітычнымі монстрамі ўжо не адэкватная наяўнай сытуацыі. Мудра для дэмакратычных сілаў было б усяляк спрыяць пераарыентацыі Беларусі, нават калі для гэтага трэ будзе пайсьці на хаўрус з Лукашэнкам. Легітымізацыя рэжыму не на карысьць апазыцыі, але на карысьць Беларусі ў гэтых умовах. Піша **Дзяніс Мельянцоў**.

# Ізаляцыя Расеі і наступствы для Беларусі



Вайна ў Грузіі сталася нечаканасьцю і нават шокам для палітыкаў, дыпляматаў і назіральнікаў ва ўсім сьвеце. І справа нават ня ў страце чалавечых жыцьцяў і трагедыі для каўкаскіх народаў, а ў тым, што такі, здавалася б, невялікі лякальны канфлікт можа зварушыць усю сыстэму міжнародных зносінаў і прывесьці да значных геапалітычных пераменаў. Спроба Грузіі рэінтэграваць Паўднёвую Асэтыю і агрэсія Расеі супраць Грузіі прывялі, перш за ўсё, да рэзкага зьмяненьня статусу Расеі як вялікай дзяржавы.

Міжнародная супольнасьць прызнала Расею агрэсарам, ЗША заклікалі выключыць яе зь Вялікай восемкі, Расея фактычна разарвала свае дачыненьні з NATO. Палітыкі і экспэрты зноў загаварылі пра магчымасьць «халоднай вайны», а суседнія з Расейскай Фэдэрацыяй краіны пераглядаюць свае абарончыя дактрыны. Упершыню пасьля распаду СССР Расея апынулася ў такой ізаляцыі. Што гэта можа азначаць для міжнароднай сыстэмы і яе найбліжэйшага атачэньня?

### Расея як пагроза

Блізу двух дзесяцігодзьдзяў сьвет адвучваўся ўспрымаць Расею як пагрозу.

Пасьля заканчэньня «халоднай вайны» і распаду сацыялістычнага лягеру Расея ператваралася ў слабую рэгіянальную дзяржаву, яе войска дэградавала, а колькасьць насельніцтва стала хутка скарачацца.

У такіх варунках пра імпэрскія амбіцыі, а тым больш пра імпэрскую замежную палітыку давялося забыцца. Нават з ростам цэнаў на вуглевадароды, паступовай эканамічнай стабілізацыяй і спробамі выкарыстоўваць сваё выгаднае становішча экспарцёра энэрганосьбітаў Расея ўсё роўна не ўспрымалася як сур'ёзная пагроза міжнароднай стабільнасьці і працягвала заставацца часткай міжнароднай палітыкі і міжнародных структураў.

Расейская замежная палітыка пасьля распаду СССР — гэта шэраг правалаў і стратэгічных памылак. Пачынаючы ад першай чачэнскай вайны і заканчваючы каляровымі рэвалюцыямі ў постсавецкіх краінах. Самі расейскія грамадзяне ўжо даўно прызвычаіліся да такога стану рэчаў і не чакалі ад свайго кіраўніцтва рашучых дзеяньняў у адказ на ўвод грузінскіх войскаў у Цхінвалі.

Сытуацыя ў Паўднёвай Асэтыі паставіла Крэмль перад вельмі жорсткім выбарам: калі Расея не ўмяшаецца ў канфлікт і не падтрымае асэтынаў, то яна страціць усялякі прэстыж у вачах каўкаскіх народаў і ўласных грамадзянаў, а таксама ўмацуе Грузію; калі ўмяшаецца — то гэта пацягне за сабой такія міжнародныя наступствы, якія нават цяжка спрагназаваць. Расея абрала апошняе. І гэта ня ёсьць нечаканасьцю, калі прааналізаваць эвалюцыю ўнутрыпалітычнай сытуацыі ў Расеі і дынаміку яе дачыненьняў з Захадам. Расея проста чакала спрыяльнага моманту.

### Гісторыя супярэчнасьцяў

Ужо зь сярэдзіны 1990-х у Расеі пачынаюць зьяўляцца разыходжаньні ў інтарэсах з Захадам, якія некалькі разоў прыводзілі да сур'ёзных крызісаў у зносінах. Адно зь першых такіх непаразуменьняў было зьвязанае з «аднаўленьнем канстытуцыйнага ладу» ў Чачэніі (так афіцыйна называлася ваенная кампанія супраць чачэнскіх сэпаратыстаў), падчас якога на міжнародным узроўні была ўзьнятая праблема парушэньня правоў чалавека ў Расеі. Потым былі дыпляматычныя войны з NATO з нагоды прынятага Альянсам рашэньня пашыраца на ўсход і вайсковай апэрацыі ў Косаве ў 1999 г. Стратэгічныя і тактычныя супярэчнасьці выліліся ў спробу Масквы ўтварыць альтэрнатыўны вайскова-палітычны блёк на падставе заключанай у 1992 г. Дамовы аб калектыўнай бясьпецы, аднак на сёньняшні дзень АДКБ так і ня стала дзейнай супрацьвагай Альянсу.

Сфэра ўплыву Расеі працягвае звужацца.

Падобна на тое, што цяпер гэтая сфэра дасягнула пэўнай мяжы памяншэньня, за якой Крэмль ужо гатовы супрацьдзейнічаць гэтаму працэсу вайсковымі мэтадамі, як мы тое назіралі ў Грузіі.

Калі праводзіць аналёгію з «халоднай вайной», то сваю фултанскую прамову Пуцін агучыў у Мюнхэне ў лютым 2007 г., у якой зьвінаваціў Захад у падвойных стандартах і пабудове аднапалярнага сьвету, а таксама абгрунтаваў права Расеі праводзіць незалежную замежную палітыку. Такім чынам, пра супярэчнасьці паміж Захадам і Расеяй было заяўлена адкрыта. Усьлед за гэтым Расея прыпыніла свой удзел у Дамове пра звычайныя ўзброеньні ў Эўропе, што стала адным з найважнейшых крокаў у працэсе разбурэньня наяўнай ад савецкіх часоў сыстэмы бясьпекі ў Эўропе.

Вайна ў Грузіі стала моцным штуршком для далейшага пагаршэньня ўзаемінаў Расеі з Захадам. Пайшоўшы на вайсковы канфлікт з Грузіяй, Расея фактычна апынулася ў поўнай ізаляцыі. Яе не падтрымалі нават саюзнікі па СНД і АДКБ.

Апынуліся разбуранымі ўсе сувязі з эўраатлянтычнымі структурамі, якія будаваліся на працягу больш чым дзесяці гадоў. Былі скасаваныя ўсе супольныя вучэньні Расеі з NATO, а таксама пастаўленае пад пытаньне функцыянаваньне транзытнага калідору ў Аўганістан, прадастаўленага Расеяй для Альянсу.

На сёньняшні дзень напружанасьць працягвае нарастаць. Крэмль афіцыйна прызнаў незалежнасьць Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі, а NATO працягвае нарошчваць вайсковую прысутнасьць у Чорным моры. Такім чынам, канфлікт яшчэ далёкі ад свайго вырашэньня.

### Прычыны ізаляцыі

Прычыны нарастаньня супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Захадам даўнія і складаныя. Іх можна шукаць у прыродзе самой расейскай цывілізацыі, што выдатна зрабіў у свой час Джордж Кенан у сваёй «Доўгай тэлеграме». Калі ж зьвяртацца да прычынаў гістарычна больш нам блізкіх, то тут неабходна прыгадаць спрыяльную для Расеі эканамічную каньюнктуру, якая дазволіла стабілізаваць эканоміку пры дапамозе нафта- і газадаляраў і вярнуць краіну ў лік вялікіх дзяржаваў з адпаведнымі гэтаму статусу амбіцыямі. Цэнтрабежныя тэндэнцыі 1990-х і адсутнасьць дэмакратычных традыцыяў прывялі да пабудовы моцнай вэртыкалі ўлады і ўсталяваньня кантролю над сродкамі масавай інфармацыі, што было неабходна для зьдзяйсьненьня рэінтэграцыі тэрыторыі і кансалідацыі грамадзтва. А як паказвае гісторыя, для кансалідацыі грамадзтва няма нічога лепшага за добра намаляваны вобраз уяўнага ці рэальнага ворага, які дазваляе каналізаваць залішнюю незадаволенасьць і агрэсію грамадзянаў, а таксама падвысіць іх ляяльнасьць да

**Працяг на старонцы 4.**

# Ізаляцыя Расеі і наступствы для Беларусі

Працяг са старонкі 3.

дзяржавы. Іншай прычынай росту супярэчнасьцяў стала таксама і кансалідацыя Захаду, якая выявілася ў пашырэньні Эўрапейскага саюзу і NATO да межаў Расеі. Гэта не магло ня выклікаць адмоўнай рэакцыі Крамлю. Пакуль гэтая рэакцыя была толькі палітычная і дыпляматычная — гэта нікога ўсур'ёз не турбавала. Але Расея, якая мае магчымасьць і жаданьне весьці баявыя дзеяньні па-за ўласнымі межамі, — гэта ўжо зусім іншая Расея. І яна ўяўляе зь сябе пагрозу.

### Ці будзе новая «халодная вайна»?

Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба прыгадаць дэфініцыю гэтай зьявы. Такім чынам, «халодная вайна» — гэта глябальная геапалітычная, ідэалягічная і эканамічная канфрантацыя паміж блёкамі дзяржаваў, якая суправаджаецца гонкай узбраеньняў. Для біпалярнага супрацьстаяньня неабходная наяўнасьць уласна самых полюсаў, вайскова-стратэгічны парытэт, а таксама ідэалягічны антаганізм або розныя каштоўнасныя ці палітычныя сыстэмы.

На сёньняшні дзень мы назіраем нарастаньне геапалітычнай канфрантацыі паміж Расеяй і Захадам на падставе разыходжаньня інтарэсаў і каштоўнасьцяў. Акрыяўшы ад эканамічнага заняпаду, Расея спрабуе захаваць сваю сфэру ўплыву і пашырыць рычагі ўплыву на постсавецкай прасторы, выкарыстоўваючы для гэтай мэты, у прыватнасьці, энэргетычныя рэсурсы. Акрамя таго, Расея супрацьпастаўляе сябе сьвету дэмакратыі па-амэрыканску, пакідаючы за сабой права на ўласны шлях разьвіцьця, які не супадае з агульным трэндам, што адстойваюць ЗША.

Разам з тым Расея занадта слабая ў эканамічным і вайсковым пляне для таго, каб вытрымаць супрацьстаяньне Злучаным Штатам і NATO.

Паводле дадзеных Сусьветнага даведніка ЦРУ, Расея паводле ВУП на душу насельніцтва ў 2007 г. знаходзілася на 76-м месцы ў сьвеце, а паводле абсалютных лічбаў ВУП — на дзявятым (розьніца з ВУП ЗША складае 7 разоў, з ЭС — столькі ж). Абаронныя выдаткі Расеі ў 2007 г. склалі 35,4 млрд даляраў, у той час як ЗША патрацілі 547 млрд даляраў, а Вялікабрытанія — 59,7 млрд.

У адрозьненьне ад ЗША, у Расеі фактычна няма саюзьнікаў, на якіх яна магла б абаперціся ў такім супрацьстаяньні. Вайна ў Грузіі выдатна прадэманстравала непрыдатнасьць АДКБ як у вайсковым, гэтак і ў палітычным пляне. Нават Беларусь не пасьпяшалася ўхваліць дзеяньні свайго партнёра па саюзнай дзяржаве.

Нягледзячы на адрознае бачаньне палітычнага ладу, паміж Захадам і Расеяй сёньня няма той прорвы, якая была паміж Захадам і СССР падчас «халоднай вайны». І ў Нью-Ёрку, і ў Маскве той самы капіталізм і тыя самыя макдоналдзы, аднолькавыя стандарты спажываньня і падобны лад жыцьця. Акрамя таго, Расея моцна залежыць ад Захаду, і гэта не дазволіць ёй пайсьці на адкрытую канфрантацыю. Асноўным кірункам экспарту расейскіх вуглевадародаў зьяўляецца аб'яднаная Эўропа. Гэта азначае ня толькі залежнасьць Эўропы ад Расеі, але таксама і Расеі ад Эўропы, бо труба, як вядома, мае два канцы, а расейская эканоміка вельмі моцна залежыць ад продажу сыравіны. Так званы расейскі стабілізацыйны фонд, які ўтвараецца з звышпрыбыткаў ад продажу газу, захоўваецца на валютных рахунках замежных банкаў, якія ў выпадку вайны ці сур'ёзнай канфрантацыі могуць быць папросту замарожаныя.

Адчуўшы сваю моц, Расея агрызаецца і стараецца ўтрымаць статус вялікай дзяржавы праз агрэсіўныя дзеяньні ў сваёй былой сфэры ўплыву. Яна можа весьці лякальныя войны, але яна не гатовая да глябальнага супрацьстаяньня з такой гіпэрдзяржавай, як ЗША. Масква разбурае міжнародна-праўныя рэжымы і робіць гучныя заявы, але яна паводле сваіх магчымасьцяў зьяўляецца звычайнай рэгіянальнай дзяржавай, якая ня мае патэнцыялу стаць новым геапалітычным полюсам.

Новай «халоднай вайны» ня будзе. У найгоршым выпадку Расея проста ператворыцца ў яшчэ адну дзяржаву-ізгоя.

### Што рабіць суседзям?

Ізаляцыя Расеі не прынясе нічога добрага. Тым больш, што ў нас ужо ёсьць такі гістарычны прыклад, які меў месца ў пачатку мінулага стагодзьдзя. Ізаляцыя прывядзе да яшчэ большых абэрацыяў успрыманьня расейскім кіраўніцтвам міжнароднай палітыкі, што канечне спрычыніцца да неадэкватных замежнапалітычных дзеяньняў, росту мілітарызму і аўтарытарызацыі ўнутрыпалітычнага ладу. Як ужо было адзначана, Расея не гатовая да «халоднай вайны» з Захадам, але яна цалкам здатная весьці рэгіянальныя войны за тэрыторыю і палітычны ўплыў, што было прадэманстравана ў Грузіі. І перш за ўсё актыўнасьць Расеі будзе скіраваная на былыя савецкія тэрыторыі, што сталі незалежнымі дзяржавамі.

Некаторыя заходнія палітолягі ўжо нават называюць наступныя аб'екты расейскай агрэсіі.

Аднак падчас вайны ў Грузіі занепакоенасьць у суседзяў Расеі выклікалі ня толькі паводзіны Крамлю, але і бязьдзейнасьць заходніх саюзьнікаў Саакашвілі, якія не аказалі ніякай рэальнай падтрымкі грузінам у той час, калі расейская авіяцыя бамбіла Горы і Поці. Нагода задумацца зьявілася ня толькі для Ўкраіны, але таксама і для Балтыйскіх краінаў, якія зьяўляюцца сябрамі NATO. Сапраўды, ці гатовыя ЗША і заходнеэўрапейскія краіны распачынаць трэцюю сусьветную вайну праз напад на Латвію ці Эстонію? Тым больш што ў гісторыі NATO не было ніводнага прэцэдэнту задзейнічаньня пятага артыкулу Статуту Альянсу (дзе ідзе гаворка пра калектыўную абарону), акрамя 11 верасьня 2001 г. NATO нават ня мае пляну абароны краінаў Балтыі. Кошт такога канфлікту будзе занадта вялікім для ўсяго Захаду. І хутчэй за ўсё, інтарэсы малых саюзьнікаў будуць праігнараваныя.

Тым часам, у Рызе была скліканая Рада нацыянальнай абароны, якая прыняла рашэньне перагледзець дачыненьні з Расеяй і ступень падрыхтаванасьці дзяржавы да абароны.

> Выглядае на тое, што якраз сёньня для Беларусі настае той момант ісьціны, калі вырашаецца лёс краіны на доўгія гады.

Літва пакуль што паводзіць сябе больш стрымана, аднак некаторыя палітычныя сілы, у прыватнасьці літоўскія кансэрватары («Саюз Айчыны»), заклікаюць прыпыніць працэс прафэсіяналізацыі арміі і вярнуцца да канцэпцыі тэрытарыяльнай абароны. Аднак, нават вярнуўшыся да ўсеагульнага прызыву, ці здолее Літва абараніць сябе ад магчымай расейскай агрэсіі? Адказ тут відавочны.

Ізаляцыя Расеі прывядзе да абвастрэньня геапалітычнага змаганьня за постсавецкую прастору. Насуперак меркаваньням пра вырашаную справу зь сяброўствам Украіны ў NATO, бітва за гэтую былую савецкую рэспубліку яшчэ ня скончылася. Украіна занадта важная для расейскіх імпэрскіх плянаў, каб аддаць яе бяз бою.

І ў ЗША, і ў Расеі добра памятаюць старую максыму Бжазіньскага, згодна зь якой Расея ніколі ня зможа стаць імпэрыяй без Украіны. І вайна за Ўкраіну, у адрозьненьне ад Грузіі ці Эстоніі, цалкам можа стаць пачаткам новага глябальнага канфлікту.

Беларусь у шэрагу суседзяў Расеі падаецца ў найбольш бясьпечнай пазыцыі. Аднак канфлікт у Грузіі прымусіў і беларускае кіраўніцтва задумацца над сваім лёсам. Бо для Беларусі «прапанова» ўвайсьці ў склад ухсодняга саюзьніка шасьцю абласьцямі ўсё яшчэ актуальная.

І цяпер, калі супрацьстаяньне паміж Расеяй і Захадам дасягнула свайго апагею, Менску давядзецца рабіць вельмі жорсткі выбар — з кім ён. Звычайная палітыка лявіраваньня паміж двума геапалітычнымі монстрамі ўжо не адэкватная наяўнай сытуацыі.

І выбар тут невідавочны.

Выглядае на тое, што акурат сёньня для Беларусі настае той момант ісьціны, калі вырашаецца лёс краіны на доўгія гады.

І ці не таму былі выпушчаныя палітычныя вязьні? Ці не таму прылятаў у Менск прадстаўнік Дзяржддэпартамэнту? І ці не таму Лукашэнка не сьпяшаецца з прызнаньнем Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі?

Але разам з тым гучаць і словы беларускага прэзыдэнта пра «мудрыя і прыгожыя» дзеяньні расейскай арміі ў Грузіі і падрыхтоўка да падпісаньня пагадненьня аб адзінай сыстэме супрацьпаветранай абароны Беларусі і Расеі. Пакуль што быць саюзьнікам Расеі для Лукашэнкі нашмат выгадней, чым разварочвацца на Захад і праводзіць комплекс рэформаў. Але гэта цяпер. Як паказваюць падзеі апошняга месяца, сытуацыя можа разьвівацца вельмі хутка. І да гэтага трэба быць падрыхтаваным.

Калі казаць пра бясьпеку беспасярэдніх суседзяў Расеі, то тут бачыцца некалькі магчымасьцяў:

Па-першае, для краінаў, якія не зьяўляюцца сябрамі NATO, неабходна скарыстаць спрыяльны момант для таго, каб атрымаць паўнавартаснае сяброўства ў гэтай арганізацыі, якая дае пэўныя гарантыі бясьпекі. Перш як напасьці на краіну-ўдзельніцу Альянсу, Расеі трэба будзе моцна падумаць.

Па-другое, як было ўжо сказана вышэй, само сяброўства ў NATO не дае поўнай гарантыі бясьпекі для малых дзяржаваў, таму выйсьце можа быць знойдзена праз рэалізацыю сумесных абаронных праектаў наўпрост са Злучанымі Штатамі, як гэта ўжо зрабілі Польшча і Чэхія. Але тут ёсьць і свой адваротны бок — у такім разе краіна становіцца беспасярэднім мішэньню для расейскіх ракетаў.

Па-трэцяе, краіны Ўсходняй Эўропы ў мэтах падвышэньня ўласнай бясьпекі могуць аб'яднацца ў вайскова-палітычны блёк, які б ахопліваў тэрыторыю былога Вялікага Княства Літоўскага або Рэчы Паспалітай.

Гэта магло б быць выйсьцем як для краінаў-удзельніцаў ЭС і NATO (падвышэньне палітычнай вагі ў межах эўраатлянтычных структураў), гэтак і для такіх краінаў, як Украіна і Беларусь (апасродкаваная прывязка да ЭС і NATO, рэзкае падвышэньне геапалітычнай важнасьці дзяржаўных тэрыторыяў, павелічэньне абароннага патэнцыялу).

На сёньняшні дзень пагроза Расеі не настолькі актуальная для краінаў усяго рэгіёну для таго, каб рэалізаваўся апошні сцэнар, але пэўныя тэндэнцыі ў гэтым кірунку ўжо праглядаюцца. Яны перш за ўсё выражаюцца ў наладжваньні больш цесных стасункаў паміж Літвой, Украінай і Беларусьсю.

Што да Беларусі, то, калі яе кіраўнікі хочуць захаваць рэальную незалежнасьць краіны, ім неабходна прыняць прапановы Эўропы і ЗША і рухацца ў бок сяброўства ў эўраатлянтычных структурах. Тым болей, што фармальных перашкодаў тут ня так шмат, як падаецца. Беларусь ня мае тэрытарыяльных і этнічных канфліктаў і прэтэнзіяў да суседніх дзяржаваў, эканамічныя паказчыкі не нашмат горшыя за Сэрбію і Альбанію, насельніцтва адукаванае і дысцыплінаванае. Праблема толькі ў цывілізацыйным выбары і палітычных рэформах. А гэтыя пытаньні вырашаюцца на працягу аднаго дзесяцігодзьдзя.

Натуральна, беларуская апазыцыя будзе выступаць супраць нарошчваньня кантактаў Беларусі з Захадам пры захаваньні дзейнага кіраўніка дзяржавы, нават калі апошні пойдзе на праўдзеньне ўнутрыпалітычных рэформаў і эканамічнай лібэралізацыю. І гэта будзе абгрунтоўвацца ў маральных катэгорыях, неабыякавых для Захаду. Аднак такую пазыцыю трэба прызнаць недальнабачнай і нават шкоднай для нацыянальных інтарэсаў Беларусі, бо яна перашкаджае выкарыстаньню гістарычнага шанцу для краіны выйсьці з-пад уплыву Масквы і далучыцца да заходняй цывілізацыі.

Паколькі палітыка — гэта мастацтва магчымага, то нашмат больш мудрым для дэмакратычных сілаў было б усяляк спрыяць пераарыентацыі Беларусі, нават калі для гэтага трэба будзе пайсьці на часовы хаўрус з Лукашэнкам. Легітымізацыя рэжыму не на карысьць апазыцыі, але на карысьць Беларусі ў гэтых умовах.

Таму гэты выбар будзе таксама і тэстам для беларускіх палітыкаў на наяўнасьць стратэгічнага і дзяржаўнага мысьленьня. Ад таго, як яны яго пройдуць, будзе залежаць і будучыня беларускай апазыцыі ў цэлым.

# Адны верацць, другія — не

Працяг са старонкі 1.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На прэзыдыюме АДС вымаляваліся контуры поствыбарных кааліцый.**

У Барысаўскай вясковай акрузе адмоўлена ў рэгістрацыі мясцоваму лідэру Сяргею Салашу.

Увогуле, сярод маладых кандыдатаў, што балятуюцца па сьпісе АДС, страты істотныя — так, нібыта ўлады хацелі паказаць: актыўнай моладзі не пацерпім. У Менску не зарэгістравалі былога лідэра «Правага альянсу» Юрася Карэтнікава, а ў Мастах — дэпутата мясцовага гарсавету Зьмітра Кухлея.

Сярод незарэгістраваных кандыдатаў ад ПКБ: Аляксандар Галькевіч (Баранавіцкая-Ўсходняя №6), Павал Станеўскі (Шчучынская №60) — тутака без альтэрнатывы будзе ісьці намесьніца старшыні аблвыканкаму Бірукова, Васіль Лапацін (Бярэзінская №61), Міхаіл Сілівонец (Жыткавіцкая №39). Камуністы яшчэ спадзяюцца, што рашэньні па нерэгістрацыі некаторых кандыдатаў будуць скасаваныя.

Чатыры чалавекі ад АГП сышлі з барацьбы за дэпутацкі мандат. Гэта былы палітвязень Іван Крук (Івейская №53), Мікалай Уласевіч (Смаргонская, №59), Артур Цурбакоў (Гомельская-Навабеліцкая №36), Адам Варанец (Гомельская-Вясковая №37).

Тым ня менш, лідэр АГП Анатоль Лябедзька застаецца пераканаными прыхільнікам байкоту. «Сабраўшы па Менску і іншых кутках краіны больш за 500 подпісаў магу сьмела казаць, што ідэяй байкоту жывуць толькі сярод 2—3% выбарцаў», — мяркуе ён.

Ад БСДП не зарэгістравалі трох кандыдатаў: Алега Мікуліна (Віцебская-Вясковая №21), Максіма Камароўскага (Рагачоўская №45), пэнсіянэрку Ірыну Вештарт (Смаргонская №59) — у яе акрузе безальтэрнатыўна ідзе лідэрка праўладных камуністаў Тацяна Голубева.

Увогуле, Гарадзеншчына застаецца для ўладаў найбольш падазроным рэгіёнам. Тут найбольш адмоваў, найбольш безальтэрнатыўных акругаў.

«Ірына Вештарт — чалавек вядомы ў Смаргоні, яна некалькі разоў была дэпутатам гарсавету. Думаю, што яе шанцы расцэньваліся б як вельмі высокія», — кажа старшыня БСДП Анатоль Ляўковіч. Самога Ляўковіча зарэгістравалі ў Берасьці.

Сярод сяброў зьліквідаваных Партыі працы і партыі жанчын «Надзея» адмоўлена ў рэгістрацыі Ўладзімеру Лазоўскаму (Васьняцоўская №93) і Алене Яськовай (Грушаўская №98).

Не зарэгістравалі незалежнага кандыдата, палітоляга Алеся Лагвінца (Сухараўская акруга, Менск), Сяргея Салаша (БНФ) у Барысаве.

З 51 вылучэнца «Эўрапейскай кааліцыі» зарэгістравалі толькі 22. Зь вядомых людзей адмовілі лідэру кааліцыі Міколу Статкевічу, старшыні аргкамітэту Партыі свабоды і прагрэсу Ўладзімеру Навасяду, лідэру прадпрымальнікаў Аляксандру Макаеву, рэдактару «Борисовских новостей» Анатолю Букасу. Паводле словаў Статкевіча, асабліва вялікія страты па Менску і заходніх рэгіёнах краіны.

Рэгістрацыю жаўнера тэрміновай службы з Кажан-Гарадка Віталя Каратыша Ярмошына назвала «росквітам дэмакратыі». Хлопцу на час выбарчай кампаніі далі месячны адпачынак у вайсковай частцы.

Агулам кандыдатамі ў дэпутаты былі зарэгістраваныя 276 чалавек (усяго вылучалася 365). Конкурс на дэпутацкае месца на дадзены момант складае 2,5 чалавекі на месца. У 2000 г., калі апазыцыя байкатавала выбары, гэты паказьнік быў роўны 5,3 чалавекі, у 2004 — 3,26. Сёлета ўжо пабіты антырэкорд.

На пытаньне, ці згодны ЦВК прыняць падарунак ад заходніх краінаў у выглядзе празрыстых скрыняў, Ярмошына адказала: «Параўноўваць залежнасьць выбараў ад празрыстасьці скрыняў — гэта тое самае, што сьцьвярджаць, быццам жанчына, на якой менш вопраткі, мае больш адкрытую душу і чыстыя думкі, чым тая, якая ходзіць у наглуха зашпіленым швэдры. Галоўнае, што знаходзіцца ў гэтай скрыні. Нельга вызначыць звонку, што там — папера ці выбарчыя бюлетэні».

30 жніўня Сойм Партыі БНФ прыняў рашэньне аб зьняцьці сваіх кандыдатаў. Гэта адбудзецца 23 верасьня, за пяць дзён да выбараў. Падобнае рашэньне прыняў і аргкамітэт Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі.

У нядзелю пытаньне ўдзелу ў выбарах разглядалася і на пасяджэньні Палітрады АДС. Старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі заклікаў падтрымаць рашэньне партыі аб сьпыненьні ўдзелу ў выбарчай гонцы. Аднак кіраўніцтва апазыцыйнай кааліцыі падтрымала кампрамісны варыянт, паводле якога Палітрада павінна сабрацца 21 верасьня і яшчэ раз разгледзець усе магчымыя варыянты.

«Уладу неабходна ўжо цяпер ставіць перад выбарам, хочуць яны, каб вынікі выбараў былі прызнаныя або не», — кажа нязгодны з рашэньнем АДС Лявон Баршчэўскі.

Аднак тры вылучэнцы АДС заявілі, што здымаюць свае кандыдатуры, ужо 1 верасьня. Усе выпадкі зафіксаваныя на Гомельшчыне. Зьняліся кіраўнік Гомельскай абласной арганізацыі АГП Васіль Палякоў (Гомельская Савецкая акруга №34), Леанід Судаленка з АГП (Хойніцкая №47) і Валеры Пуціцкі ад БНФ (Рэчыцкая №44). Відаць, гэта не апошнія падобныя выпадкі.

Такім чынам, у краіне ўжо цяпер паўтара дзясятка безальтэрнатыўных акругаў. А калі АДС, насуперак заклікам ЗША і ЭС, таксама праігнаруе выбары — то іх стане ўсе 50 працэнтаў. Гэта наўрад ці спадабалася б выбарцам. Як паказваюць апытаньні грамадзкае думкі, каля 70% беларусаў лічаць дэмакратыю каштоўнасьцю.

Калі лёгіка дзеяньняў улады не зьмянілася, пасьля 28 верасьня ў выйгрышы акажуцца Баршчэўскі і Саньнікаў як лідэры, што імкнуліся сарваць сцэнар уладаў, навязаць сваю гульню. Калі ж лёгіка дзеяньняў улады зьмянілася, то навідне акажуцца асобы, вызначаныя ўладамі як дэпутаты палаты ад апазыцыі. У кулюарах пагаворваюць, што імі маглі б стаць, напрыклад, Ярослаў Раманчук і Станіслаў Багданкевіч — два лібэралы, два каталікі. Аднак пасьля апошняга паседжаньня АДС 31 жніўня былы кіраўнік Нацбанку Беларусі заявіў: «Парлямэнцкія выбары нельга лічыць сумленнымі і справядлівымі. Прыхільнікаў дэмакратыі ў Беларусі нямала, аднак па тэлебачаньні, па радыё мы маем магчымасьць выступіць аднойчы ў чатыры гады. Няўжо можна казаць, што ў народу ёсьць выбар? У маёй Чкалаўскай акрузе ва ўчастковыя камісіі ня ўключаныя такія вядомыя і паважаныя ў Беларусі людзі, як Зінаіда Бандарэнка, Павал Казлоўскі, Анатоль Паўлаў, Васіль Шлындзікаў. Як пасьля гэтага Лукашэнка можа заяўляць, што «выбары абдудуцца без падману»? Лічу, што ўлады нічога ня зробяць, акрамя словаў. Я загадзя ведаю, што здымуся з выбараў».

**Зьміцер Панкавец**

### Баршчэўскі: Незалежна ад выбараў Захад будзе супрацоўнічаць з Лукашэнкам

Улады гатовыя прапусьціць у парлямэнт аднаго прадстаўніка са сьпісу АДС. Такую заяву зрабіў старшыня партыі БНФ Лявон Баршчэўскі на Сойме партыі. Галоўная мэта ўладаў падчас гэтай выбарчай кампаніі — легітымізаваць Палату прадстаўнікоў, лічыць Баршчэўскі. Дзеля гэтага Лукашэнка нават згодзен прапусьціць у парлямэнт прадстаўнікоў сапраўднай апазыцыі, адабраўшы гэтае месца ў кішэннай Лібэральна-дэмакратычнай партыі. Паводле словаў Л.Баршчэўскага, адзін высокі міжнародны чыноўнік паведаміў яму, што Захад прыняў стратэгічнае рашэньне супрацоўнічаць з рэжымам Лукашэнкі па абмежаваным коле пытаньняў. Пасол Нямеччыны ці нейкай іншай краіны прапануе, каб у Палату прадстаўнікоў былі ўключаныя 2—3 чалавекі ад АДС, пакуль гаворка ідзе рэальна пра аднаго, замест Гайдукевіча. Таму ён так і пакрыўдзіўся, што яго мяняюць на прадстаўніка ад АДС.

**Паводле радыё «Рацыя»**

## «У парлямэнт патрапяць людзі, якія размаўляюць на адной мове з уладай»

Палітоляг **Аляксандар Фядута** пра парлямэнцкія выбары.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Ці ёсьць шанцы ў апазыцыі патрапіць у парлямэнт?**

**Аляксандар Фядута:** Натуральна, што выбары будуць сфальсыфікаваныя. У мяне гэта не выклікае пытаньняў. Разам з тым, у мяне не выклікае пытаньняў і тое, што апазыцыя ў парлямэнце вельмі патрэбная ўладзе. Гэта патрэбна, бо ўлады спрабуюць дамовіцца з Захадам адносна нейкіх гарантый незалежнасьці краіны ад Расеі. Думаю, што ўлада пагодзіцца з тым, каб прапусьціць у парлямэнт некалькі апазыцыянэраў. Колькі іх будзе? Гэта ўжо як карта ляжа.

**«НН»: Ці будуць гэта слабыя дэпутаты, дзейнасьць якіх будзе лёгка кантраляваць?**

**АФ:** Гэта будуць людзі, якія здольныя размаўляць з уладай на адной мове. Я ня маю на ўвазе расейскую мову, я гавару пра пэўную мову панацыяў. Уладзе патрэбныя дэпутаты, якія, скажам, займаліся б эканомікай, але ня лезьлі ў праблемы адсутнасьці дэмакратыі ці свабоды слова.

**«НН»: А ці здольны нехта з апазыцыйных кандыдатаў перамагчы на гэтых выбарах?**

**АФ:** Вельмі складана казаць. Сапраўдных выбараў у краіне не было вельмі даўно. І тое, як насамрэч думае народ, не пакажа сёньня ніводнае сацыялягічнае апытаньне.

**«НН»: Ці варта апазыцыі сёньня сканцэнтравацца на ідэі байкоту?**

**АФ:** Калі байкот ажыцьцяўляецца разумнымі людзьмі, то ён можа прынесьці пэўныя вынікі. Напрыклад, ён можа прымусіць уладу даць мандаты пэўнай колькасьці апазыцыянэраў. Але паўтаруся, у такім выпадку неабходна, каб ідэя байкоту ажыцьцяўлялася вельмі разумна.

**«НН»: Вялікая колькасьць безальтэрнатыўных акругаў — плюс ці мінус для апазыцыі?**

**АФ:** Гэта мінус для ўладаў, а для апазыцыі любы мінус улады — гэта плюс.

**Гутарыў ЗП**

# Голы японец у цэнтры Менску

Фэстываль пэрформансу «Навінкі—2008», што пачаўся 29 жніўня ў Палацы мастацтваў і закончыўся 1 верасьня на возеры Вяча, парадаваў усіх. Піша **Павал Касьцюкевіч**.


Юлія Дарашкевіч

«Што гэта? Мастацтва?! А псыхбрыгаду вы ўжо выклікалі?»

Па-першае, вельмі ўсьцешыўся беларускі гандаль. Паводле самых сьціплых падлікаў, для свайго пэрформансу нью-ёркавец Томас Стывэнсан (ён сшываў ніткай вяровачныя лескі з цукерак) купіў як найменей 15 кг карамэлек.

Не раўнуючы як у тым анэкдоце пра вясковага дзядзьку, які трапіў на тэатральнае прадстаўленьне і на пытаньне дачкі, што яму спадабалася найбольш, адказаў: «Канечне, самы канец, калі выдавалі палітоны, — я ўзяў сабе тры», беларускія пэрформэры Дзьмітры і Тацяна Майбарада таксама вырашылі інвэставаць у свайго гледача.

Яны пашыхтавалі публіку ў сярэдзіну залі, разулі яе і склалі ўвесь абутак у купы. Потым, па невялікім часе, відаць, для прыліку зрабіўшы некалькі рухаў, раздалі абутак назад. Гэткім парадкам пэўная частка публікі атрымала навейшыя мадэлі чаравікаў за тыя, у якіх прыйшла на фэстываль.

Гэтак было наглядна даведзена, што пэрформанс — гэта мастацтва, якое нараджаецца тут і цяпер, і размывае межы паміж гледачом і выступоўцам, стварае шчырае, непадробнае суперажываньне да іншых. Асабліва да тых, хто замест сваіх навюткіх чаравікаў атрымаў падзёртыя атопкі.

Акрамя пэрформансу неймавернай шчодрасьці, публіцы асабліва прыпаў да душы выступ ангельца Нэйла Джэфэрыза. Тут зьняпраўдзіліся ўсе закіды, маўляў, што пэрформанс далёкі ад народу. Выступ ангельца быў блізкі і зразумелы нашаму гледачу.

Сьпярша ангелец вынес у залю вялізную запэцканую пабелкай тумбу (няйнакш, скрадзеную з прылеглага будаўнічага аб’екту), у якой ляжалі бляшанкі зь півам і быў запхнуты пагнуты дарожны знак. Потым, безупынку наліваючы піва зь бляшанкі ў загадзя прыхоплены куфаль, упэцканы ў пабелку ангелец, разносячы пах сьвежаразьлітага піва, хадзіў па коле і пакрысе нішчыў свае запасы хмелю. Гэтак Нэйл, згодна з прынцыпамі размываньня межаў паміж пэрформансам і лайфам, нарадзіў у публікі неўтаймаванае жаданьне ўчыніць нешта падобнае ў летнім «вецярку» насупраць Палацу мастацтваў. Але гэты акт быў перарваны ягонымі беларускімі калегамі — замест чатырох заплянаваных на кружляньні па пакутах гадзінаў ангелец хадзіў усяго толькі адну. Калегі, відаць, былі добра абазнаныя, куды можа завесьці маладзёна тое хаджэньне па заваражаным коле.

Пасьля выступу пахнюча-белы Нэйл прызнаўся, што чэрпаў натхненьне з паводзінаў футбольных фэнаў з ускраіны ягонага роднага Манчэстэру.

Але больш за ўсіх фэстываль прыпаў да сэрца выпадковым мінакам, якія праз акварыюмныя вокны Палацу мастацтваў маглі бачыць фээрычнае і, трэба прызнацца, рэдкае для нашых шыротаў відовішча: у атачэньні сотні захопленых гледачоў на сярэдзіну залі выйшаў японскі пэрформэр Сэджы Шымода і, інтэлігентна скінуўшы штаны і сподняе, у працоўным негліжэ караскаўся на драўляны стол.

Але нават выпадковыя мінакі выглядалі дарэчна на гэтым сьвяце не прыхаванага нічым мастацтва. Калі адзін зь іх, досыць ужо стары дзядуля, заскочыў на агеньчык, а ягоныя густыя бровы далезьлі ад убачанага да самага пікейнага бэрэту, ён даволі такі праўдападобна заверашчаў: «Што гэта? Мастацтва?! А псыхбрыгаду вы ўжо выклікалі?»

Псыхбрыгаду, канечне, ніхто не выклікаў. Яна б папросту не прыехала. Бо ўяўляеце званок у сталічны псыхдыспансэр: «Алё, гэта Навінкі? Звоняць вам з «Навінак» — прыяжджайце!»

Да таго ж, цалкам імаверна, што прыход пікейных бэрэтаў на сьвята быў выдатна сплянаваным пазаконкурсным выступам. Бо падчас выступу японца напал пэрформанскіх жарсьцяў дасягнуў такога ўзроўню, што магло адбыцца што заўгодна. Ніхто і вокам не міргнуў, калі б Сэджы Шымода апрануўся, ветліва раскланяўся, дастаў з кішэні нож і зрабіў сабе наастатак пэрформанс з харакіры.

Дарэчы, назаўтра пасьля здачы матэрыялу, некаторыя сябры Рэдакцыі «НН» бачылі згаданага вышэй ангельскага пэрформэра з бляшанкамі піва «Балтыка» ў раёне вуліцы Петруся Броўкі. Таму калі вам на менскіх праспэктах сустрэнецца ўвэдзганы півам і пабелкай іншаземец, не бянтэжцеся, будзьце ласкавыя, адкажыце яму на пытаньне «Where is Navinki?». Гэта мастацтва пэрформансу, якое ня ведае межаў, выйшла ў масы.

## Памяці Яна Матусевіча

Гэтага сьвятара ведалі многія ў Беларусі. Мажны, абапіраючыся на кавеньку, ён прыходзіў на сходы і мітынгі. Ён быў першы рымска-каталіцкі сьвятар, які ў гады перабудовы загаварыў да шырокай аўдыторыі. І загаварыў па-беларуску. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Ён прыйшоў у Вільні на Ўстаноўчы зьезд Беларускага Народнага Фронту, каб нагадаць пра хрысьціянскія традыцыі і хрысьціянскія каштоўнасьці. Паколькі зьезд праходзіў у дзень сьвятога Яна Хрысьціцеля, ён запрасіў яго ўдзельнікаў на імшу ў касьцёл Сьвятога Мікалая — той самы касьцёл, у якім шмат гадоў, аж да трагічнага арышту, служыў айцец Адам Станкевіч.

З айцом Адамам гэтага ксяндза яднала ня толькі тое, што яны былі беларускімі сьвятарамі Рымска-Каталіцкай Царквы. Тыя, хто пазнаёміўся з айцом Янам бліжэй, ведаў, што ён, як ксёндз Адам Станкевіч, — бібліяфіл і што асаблівым ягоным хобі было зьбіраньне кнігаў пра мастацтва.

Як і ксёндз Адам Станкевіч, айцец Ян глядзеў на хрысьціянства ў Беларусі не з вузкаканфэсійнага гледзішча. Ён быў адкрыты для дыялёгу з праваслаўнымі і пратэстантамі. І таму невыпадкова ён стаў адным з сузаснавальнікаў Беларускага біблійнага таварыства, у якое ўвайшлі прадстаўнікі розных канфэсіяў і дэнамінацыяў.

Мажліва, гэтай адкрытасьці спрыяла тое, што рымска-каталіцкі сьвятар Ян Матусевіч (так склалася) скончыў праваслаўную духоўную сэмінарыю і добра ведаў багатыя духоўныя трыдыцыі хрысьціянскага Ўсходу.

Сьвятло Ўсходу (так называлася адно з Апостальскіх пасланьняў Папы Яна Паўла II) заўсёды было ў сэрцы, у сьвядомасьці рымска-каталіцкага сьвятара Яна Матусевіча. Да таго ж ён і служыў у асаблівай мясцовасьці — у Барунах, што на Ашмяншчыне. Служыў у сьценах былога ўніяцкага манастыра. У гэтых базыльянскіх мурах ён сузіраў абраз Маці Божае Барунскае, які шануюць і каталікі, і праваслаўныя. Маліўся да яго. І той, хто ведаў айца Яна, анітрохі не зьдзівіўся, калі на самым заранку другога абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ён стаў грэка-каталіцкім сьвятаром.

Бо хто такі грэка-каталік, уніят? Гэта праваслаўны, які жыве ў адзінстве з Рымам, з пасадам апостала Пятра. Праваслаўны, які ня хоча падзелу хрысьціянства на ўсходняе і заходняе.

Тады, на пачатку 1990-х, Ян Матусевіч быў другім грэка-каталіцкім сьвятаром у Беларусі. Першым быў ужо немалады былы вязень ГУЛАГу айцец Віктар Данілаў, якога таемна высьвяцілі яшчэ ў савецкі час. Айцец Віктар жыў у Горадні. І таму дэканам Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы быў пастаўлены маладзейшы за айца Віктара на дваццаць гадоў жыхар сталіцы айцец Ян Матусевіч.

Нехта яшчэ напіша гісторыю станаўленьня сучаснае Грэка-Каталіцкае Царквы ў Беларусі, гісторыю заснаваньня першай парафіі Сьвятога і Праведнага Язэпа ў Менску, якая адпраўляла літургію то на прыватных кватэрах, то ў падвалах, то ў «чырвоных кутках». Нехта яшчэ напіша пра тыя перашкоды Царкве, якія чыніла і чыніць ёй дзяржаўная ўлада. Але такая ўжо ў нас зямля, такая глеба, дзе сышліся Ўсход і Захад, грэцкія і лацінскія традыцыі.

Цяпер БГКЦ мае больш за дваццаць парафіяў. І калі айцец Ян Матусевіч быў першым і адзіным дэканам Царквы, дык цяпер ёсьць два дэканаты. І адзін з дэкантаў, а таксама парафію Сьвятога Язэпа ўзначальвае гадунец айца Яна — протапрэзьбітар Андрэй Абламейка. За гэтыя гады Царква атрымала пятнаццаць сьвятароў і мае сэмінарыстаў. А тое, што ў Беларусі зьявілася грэка-каталіцкае манаства, можна разглядаць як заруку будучыні Царквы, бо, як правіла, з манахаў паходзяць уладыкі, рэктары, прэфэкты.

Зь верай і надзеяй гледзячы ў будучыню, беларускія грэка-каталікі з удзячнасьцю згадваюць ў гэты дзень айца Яна Матусевіча, які пакінуў нас 2 верасьня 1998 году.

## Арлоў выдасьць наступную кнігу лацінкай




25 жніўня Ўладзімеру Арлову споўнілася 55 гадоў. Аўтар больш трох дзясяткаў кнігаў апошнім часам аддае перавагу не традыцыйным папяровым фаліянтам, а маленькім гукавым літаратурным дыскам. Тлумачыць ён жаданьне выдаваць свае творы ў выглядзе аўдыёкнігаў тым, што сучаснаму чалавеку няма часу чытаць мастацкую літаратуру, а на дысках ён можа слухаць абраныя творы ў аўто, мэтро і нават у басэйне ці ў рэчцы. Што робіць і сам пісьменьнік, вандруючы ў гэтыя дні па азёрнай Віцебшчыне. Адтуль праз тэлефон ён расказаў пра тое, што робіць у дні юбілею: «Нечакана зноў пачалі нараджацца вершы, якія, я спадзяюся, складуць новы паэтычны зборнік. Дарэчы, гэтую кнігу я хачу выдаць беларускай лацінкаю, каб такім чынам падтрымаць шматвекавую традыцыю нашай лацініцы. Адначасова гэта пэўным чынам засьведчыць і маю пазыцыю ў спрэчцы прыхільнікаў наркамаўкі і тарашкевіцы.

Апрача вершаў ёсьць і штодзённая праца над працягам нашай зь Зьмітром Герасімовічам кнігі «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя». Новае выданьне прысьвечанае мінуламу Вялікага Княства Літоўскага.

А якраз сёньня я атрымаў сыгнальны асобнік сваёй новай аўдыёкнігі гістарычных аповесьцяў і апавяданьняў «Сны імпэратара». Гэта ўжо чацьвертае выданьне маіх тэкстаў у такім фармаце. Раней былі «Час чумы», «Адкуль наш род», «Таямніцы полацкай гісторыі». Неўзабаве выйдзе яшчэ «Ордэн Белай Мышы», а на чарзе — аўдыёдыск «Паўстанцы». Разам атрымаецца цэлая аўдыёбібліятэчка, за зьяўленьне якой я ўдзячны яшчэ зусім маладой фірме «Белтонмэдыя» і яе дырэктару Алесю Калошу.

**Паводле радыё «Свабода»**

**КАЛЯНДАР**

## Верасень

**2** — Пачатак Рамазану ў мусульманаў. Гэта вялікі трыццацідзённы пост, падчас якога, ад узыходу да заходу сонца прававерным забараняецца есьці і піць, а таксама займацца іншымі ўцешнымі заняткамі, улучаючы курэньне і любошчы.

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы. Сёлета адзначаецца 494-ы раз. У гэты дзень (1514) літвіны, русіны і палякі разьбілі маскоўскае войска пад Воршай.

**8** — Міжнародны дзень салідарнасьці журналістаў.

**12** — 745 гадоў таму (1263) быў забіты заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага Міндоўг. У дзяржаве пачаўся пэрыяд палітычнай нестабільнасьці і барацьбы за ўладу.

**16** — дзевяць гадоў таму (1999) бязь сьледу зьніклі беларускі палітык Віктар Ганчар і ягоны сябар, прадпрымальнік Анатоль Красоўскі.

**20** — нарадзілася паэтка Натальля Арсеньнева (1903—1997). Яе верш «Малітва за Беларусь», пакладзены Міколам Равенскім на музыку, вядомы сёньня як гімн «Магутны Божа».

**21** — Міжнародны дзень міру. Цікава, што ў 1993 г. у гэты дзень расейскі прэзыдэнт распусьціў Думу, паклаўшы гэтым пачатак адкрытаму супрацьстаяньню з дэпутацкім корпусам.

**30** — Рош га-Шана (Новы год) у габрэяў. Паводле юдаізму, нас чакае 5769 год ад стварэньня сьвету.

**Склаў ПК**

Дзеяньні Расеі на Каўказе, калі верыць сацапытаньням, падтрымліваюць прынамсі 80% расейскага электарату. І ў гэтым нічога дзіўнага няма, калі ўлічваць прапагандысцкі эфэкт працы расейскіх дзяржтэлеканалаў. Але па-ранейшаму зьдзіўляе тое, што расейская інтэлектуальная эліта — палітолягі, гісторыкі, сацыёлягі, журналісты — амаль аднагалосна, хоць і з агаворкамі, апраўдваюць гэтыя дзеяньні. Піша **Віталь Тарас**.

# Цёплая вайна



WALL STREET JOURNAL

Дакладней так — у Паўднёвай Асэтыі расейскія войскі, маўляў, дзейнічалі слушна, бо «далі па зубах» Саакашвілі і абаранілі асэтынаў ад «генацыду». А вось пераходзіць мяжу Грузіі было ня сьлед. (Толькі дзе яна цяпер, тая мяжа?)

Чаму падаецца важным ізноў зьвярнуць на гэта ўвагу. Па-першае, таму, што ў беларускай дзяржаўнай прэсе, ды ў большасьці недзяржаўных СМІ сур'ёзнае абмеркаваньне апошніх падзеяў у Грузіі амаль адсутнічае. Не прымаць жа ўсур'ёз камэнтары ў навінах СТВ пра тое, што Беларусь безумоўна павінна падтрымаць незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі, а на рэакцыю Захаду — напляваць. (Літаральна так і заявіў нядаўна дэпутат палаты прадстаўнікоў Сяргей Касьцян.)

Па-другое, якім бы ні быў выбар цяперашніх уладаў РБ у дачыненьнях з Захадам і Расеяй, як бы ні павярнуўся далейшы лёс Беларусі, усё адно давядзецца тым альбо іншым чынам падтрымліваць стасункі з усходнім суседам, нельга іх выбудоўваць на рацыянальнай падставе. Але перадусім варта пазбавіцца некаторых ілюзіяў — у прыватнасьці, што да спадзяваньняў часткі беларускай інтэлігенцыі на «прасунутую» дэмакратычную апазыцыю ў Расеі, хоць бы ў пэрспэктыве.

Уласна кажучы, пасьля апошніх парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў тамтэйшая дэмапазыцыя перастала быць сыстэмнай. Але ж і ў дысыдэнтаў у клясычным сэнсе слова яе прадстаўнікі не ператварыліся. У ключавых пытаньнях — такіх, як замежная палітыка Расеі, — яны трымаюцца ў цэлым патрыятычнай пазыцыі, пазыцыі падтрымкі сваёй дзяржавы, крытыкуючы ўладу, хіба, за мэтады, якімі вядзецца гэтая палітыка. На такую пазыцыю, зразумела, кожны мае права. Але часам у патрыятычным парыве некаторыя палітолягі забываюцца пра свой абавязак аналізаваць падзеі і зьявы, а ня толькі даваць ім ацэнкі.

### «Мы перасталі быць ворагамі»

Характэрны прыклад — абмеркаваньне на супэрлібэральным інтэрнэт-сайце «Грані. Ру» тэмы: ці можна лічыць, што ў выніку падзеяў у Грузіі сьвет вярнуўся ў эпоху «халоднай вайны»? Усе ўдзельнікі дыскусіі фактычна ў адзін голас заяўляюць: не, «халоднай вайны» няма і быць ня можа паводле вызначэньня.

«Гэты выраз быў замацаваны за супрацьстаяньнем канкрэтных сыстэмаў, тады была ідэалягічная лінія фронту, па розныя бакі якой было шмат краінаў, аб'яднаных ідэалёгіямі. З аднаго боку — заходняя дэмакратыя, з другога — савецкі бальшавізм». (Георгі Сатараў, былы памочнік прэзыдэнта Ельцына.)

«Страх зьнік, мы перасталі быць ворагамі, зьнікла ідэалягічная канфрантацыя». (Аляксандар Канавалаў, — дырэктар Інстытуту стратэгічных ацэнак).

«Халодная вайна — гэта двубой ідэалёгіяў, якія маюць глябальны характар. Расея ня ёсьць крыніцай ідэалёгіі, што мае глябальны характар, таму халодная вайна немагчымая».(Станіслаў Бялкоўскі, які прадказваў, што Пуцін пасьля прэзыдэнцкіх выбараў сыдзе з палітыкі.)

І толькі палітоляг Дзьмітры Арэшкін дапускае, што Расея спрабуе цяпер калі не «аднавіць жалезную заслону паміж разьвітым сьветам і Расеяй, дык сьцьвердзіць псэўдасавецкую сыстэму каштоўнасьцяў». Тут ужо, як кажуць, цяплей...

Пытаньне сучасным палітолягам і гісторыкам — і ня толькі расейскім, але й беларускім: пры канцы 1940-х — у пачатку 1950-х сталінская савецкая ідэалёгія нічым не адрозьнівалася ад ідэалёгіі бальшавікоў у 1917-м? Бальшавікі, як вядома, тады высунулі лёзунгі: «Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя! Мір народам!» Але ад так званага пралетарскага інтэрнацыяналізму не засталося й сьледу ў часе Другой сусьветнай вайны. У 1942—1943 улады ўспомнілі пра сьвятую праваслаўную Русь, Аляксандра Неўскага і генэралісімуса Суворава. У 1944 пачалася масавая дэпартацыя чачэнцаў, іншых каўказцаў, калмыкаў, крымчакоў, турак-мэсхетынцаў — усіх народаў, абвінавачаных Сталіным у масавым пасобніцтве акупантам.

9 траўня 1945 году ў сваім сьвяточным тосьце Сталін прыпісаў галоўную ролю ў перамозе над нямецкім фашызмам «расейскаму народу». («Я п'ю, перш за ўсё, за здароўе расейскага народу таму, што ён зьяўляецца найбольш выбітнай нацыяй з усіх нацыяў, што ўваходзяць у склад Савецкага Саюзу».) Усім астатнім народам, як вынік, адводзілася роля здраднікаў альбо, у лепшым выпадку, памочнікаў.

Беларусы, якія перажылі нямецкую акупацыю, таксама трапілі пад падазрэньне ў нелаяльнасьці й нават супрацоўніцтве з акупантамі. Было абвешчана, што партызанскую барацьбу ў Беларусі арганізавала ЦК КПБ пад кіраўніцтвам Крамлю і пры ўдзеле доблеснага НКВД. (Між іншага, тут узьнікае яшчэ адзін момант. Думкі тых, хто лічыць, быццам партызанка была цалкам інсьпіраваная Масквой і што ў партызанах былі выключна энкавэдысты, палітрукі-«акружэнцы» і проста бандзюкі, якія займаліся рабаваньнямі ды гвалтам, мала чым, па сутнасьці, адрозьніваюцца ад цьверджаньняў былых гэбістаў і сталіністаў, якія адводзяць беларускаму народу ролю быдла. Але ў гэтым артыкуле няма патрэбы спыняцца на гэтай тэме.)

Пасьля вайны пачалася барацьба зь «нізкапаклонствам перад Захадам», а потым зь «бязроднымі касмапалітамі» (інакш кажучы — зь яўрэямі), якім забаранялі займацца культурай, навукай, займаць пасады лекараў і г.д. І ўсё гэта адбывалася на фоне антыамэрыканскай, антызаходніцкай істэрыі.

Інакш кажучы, палітыка СССР пры канцы жыцьця Сталіна была ўжо ня столькі савецкай (дакладней, ня толькі савецкай), колькі імпэрскай, прасякнутай вялікадзяржаўным расейскім шавінізмам і экспансіянізмам.

### Заканчэньне гісторыі?

Менавіта такую палітыку, як мы бачым, спрабуюць адрадзіць сёньня Пуцін і ягоная каманда. Днямі ў Расеі зьявіўся новы падручнік гісторыі СССР (1917—1945), які будзе рэкамэндаваны ў якасьці галоўнага навучальна-мэтадычнага дапаможніка для расейскіх настаўнікаў. Сталін у ім называецца самым пасьпяховым мэнэджарам XX стагодзьдзя, масавыя рэпрэсіі 1930-х апраўдваюцца «прагматычнымі задачамі» кіраўніцтва краіны, а забойства афіцэраў Войска Польскага (сярод якіх былі і беларусы) у Катыні — «гістарычнай адплатай» за забойства чырвонаармейцаў у Польшчы ў 1920-м. Апалягэты пуцінскай вялікадзяржаўніцкай палітыкі імкнуцца ўключыць дзеля сваіх мэтаў у сучасную гісторыю Расеі ўсё: ад Бізантыі і Кіеўскай Русі, улучна зь Яраславам Мудрым, ад апрычніны Івана Грознага і царскай дынастыі Раманавых да Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі, раскулачваньня (але бяз голаду, якога, канечне, не было), Другой усясьветнай і халоднай войнаў, заваяваньня космасу, ядзерных выпрабаваньняў, братэрскай інтэрнацыянальнай дапамогі Чэхаславаччыне і Аўганістану. Вось толькі гарбачоўскі і ельцынскі пэрыяды ня вельмі хоча ўспамінаць цяперашняя расейская намэнклятура, цалкам абавязаная сваім становішчам і ўзбагачэньнем Ельцыну. Ну і, канечне, сьнежань 1991 году, Віскулёўскія пагадненьні пра СНД. Іх ня толькі ня хочуць успамінаць, іх хочуць перагледзець пост-фактум, наяўным парадкам. Што ўласна кажучы, ужо й зрабіў Крэмль, прызнаўшы незалежнасьць Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі.

Лібэральная інтэлігенцыя, якая клянецца ў вернасьці ідэалам рэвалюцыі 1991-га, па сутнасьці, ня хоча прызнаць, што савецкая, сталінісцкая частка гісторыі Расеі нікуды не падзелася, што сталінізм, у крыху мадэрнізаваным і падмаляваным выглядзе, зноў навязваецца Крамлём народам Расеі і навакольным краінам у якасьці адзіна правільнай мадэлі існаваньня. Гэта і ёсьць яе цывілізацыйны выбар. Прызнаваць гэтага ня хочацца, бо гэта азначае прызнаць крушэньне сваіх дэмакратычных ідэалаў і ілюзіяў.

Да «гарачай вайны» Захаду з Расеяй справа, відаць, сапраўды ня дойдзе, як і да поўнамаштабнай «халоднай». Але ж і дзіўная халаднаватая вайна доўга працягвацца ня можа. Хто ў ёй прайграе — ясна ўжо цяпер. Расейскія танкі ў разбураным грузінскім Горы, на фоне помніка Сталіну каля музэю ягонага імя ў ягоным родным горадзе — знак таго, што кола гісторыі замкнулася. Праз 130 гадоў з дня нараджэньня Ёсіфа Джугашвілі набліжаецца заканчэньне створанай ім імпэрыі.

Лепшую дэкарацыю для гэтага цяжка было прыдумаць.


ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Віктар Ганчарэнка**

нарадзіўся ў 1977 г. у Хойніках Гомельскай вобласьці.

Гадунец хойніцкай спартовай школы і сталічнай рэспубліканскай вучэльні алімпійскага рэзэрву (РВАР). Выступаў за РВАР (1995—1997) і БАТЭ (1998—2002). Двухразовы чэмпіён Беларусі (1999, 2002). Кар'еру гульца завершыў праз сур'ёзную траўму.

Адукацыя вышэйшая. У 2004 г. скончыў Беларускую акадэмію фізычнай культуры (трэнер па футболе). У 2004 — 2006 гг. працаваў трэнерам дублюючага складу БАТЭ.

Зь лістапада 2007 г. — галоўны трэнер БАТЭ.

# Віктар Ганчарэнка: Шкада, бацька не дажыў…

Галоўны трэнэр БАТЭ адказаў на пытаньні чытачоў сайту nn.by.

**Вы малады і дасягнулі такога прарыву! Пётар Кузьміч**

Наконт дасягненьняў, такая ў нас праца. Я не лічу, што мы нешта такое зрабілі. Трэба працягваць і гуляць у футбол. Калі дамо слабіну, упадзем долу.

**Хто, на Ваш погляд, самы сур'ёзны супернік для БАТЭ? Стасюк Дземідовіч**

Усе тры каманды, якія трапілі да нас у групу, — вельмі моцныя супернікі, не стараюся іх разьдзяліць. У кожнага свой стыль, кожны небясьпечны па-свойму, у кожнай ёсьць набор высокаклясных футбалістаў.

**Як плянуеце згуляць з грандамі? Jarik**

Упэўнены ў адным, нам нельга ўсе 90 хвілінаў сядзець у абароне, абавязкова трэба контратакаваць. Больш упэўнены, што нават у адной сустрэчы можа быць усё, што заўгодна, а нават шанец перамагчы суперніка і ўсё перавярнуць з ног на галаву.

**Якая задача стаіць перад камандай у групавым этапе? Павал Яраш**

Задача ў ЛЧ — атрымаць пэўны досьвед. Нічога ня ўдасца, калі мы будзем выходзіць на матч з настроем няўдачніка. Таму будзем выходзіць з адпаведным настроем.

**Ці будуць у Лізе чэмпіёнаў выкарыстоўвацца майкі з надпісамі па-ангельску? Чаму Вы заўсёды ў трыко ходзіце? Вам бы болей пасаваў касьцюм. Іван Сташэўскі**

Патрабаваньні УЭФА — на майках футбалістаў усё мусіць быць напісана па-ангельску, улучна з рэклямай. Прозьвішчы будуць дакладна па-ангельску.

Наконт стылю вопраткі — ніколі на гульнях ня быў у трыко. Люблю прайсьціся па модных крамах і спартовую вопратку маю толькі на трэніроўках.

Наконт шыкоўных касьцюмаў — маем клюбныя касьцюмы высокай якасьці, у іх і будзем.

**Ці былі б Вы згодныя прайграць усе матчы у групе Лігі Чэмпіёнаў бяз варыянтаў і сапраўды, але перамагчы ў чэмпіянаце?**

У маім слоўнікавым запасе не існуе слова «прайграць». Хочацца выступіць удала ў ЛЧ і стаць чэмпіёнам Беларусі.

**Віктар, малю Вас, толькі ня выйграйце ў «Рэалу», бо ў нас дахі пазносіць... :) Кнехт**

Выйграем.

**Ці зьвярталі Вы ўвагу на публічныя абразьлівыя заявы прэзыдэнта «Леўскі» перад матчамі з БАТЭ? Стась зь Менску**

Сумняюся ў праўдзівасьці гэтых словаў, бо гэта баўгарская прэса. Усё ж абвінавачваць іх ня хочацца, але і давяраць цяжка. Нашыя заявы я чытаў, але вялікага значэньня ім не надаваў.

**Як Вы лічыце, якая галоўная праблема беларускага футболу? Plaschinsky**

Мне хацелася б, каб больш увагі надавалася трэнэрскім кадрам. Трэба браць больш вядучых мэтодык: гішпанскіх, італьянскіх, галяндзкіх. На мой погляд, гэта найістотнейшая праблема.

**У БАТЭ зьявілася некалькі мільёнаў незапляніраваных эўра. Як думаеце, куды пойдуць гэтыя грошы? Чалавек**

Наш клюб славіцца тым, што мы ўмеем разумна падысьці да фінансавых магчымасьцяў. Не сумняюся, што гэтыя грошы разумна размяркуем. Будуць прэміяльныя, пашырэньне базы, набыцьцё аўтобусаў. Грошы заўсёды ідуць па прызначэньні. Лішняга ніколі не бывае.

**Ці ня варта перад барысаўскімі ўладамі рубам паставіць пытаньне пра будаўніцтва ў горадзе стадыёну эўрапейскіх стандартаў на 25—30 тысячаў месцаў — з тым, каб там часам магла б гуляць і зборная? L.Barsceuski**

Будзе будавацца «Трактар», «Дынама». Што да Барысава, у нас будзе сучасны стадыён, але трэба, каб на кожнай гульні ён запаўняўся на 7—8 тысячаў.

**Што будзеце рабіць, калі галоўных футбалістаў каманды захочуць набыць замежныя клюбы? Мікола**

Гэта цалкам нармальная практыка. І мы будзем толькі за, калі нашыя футбалісты спатрэбяцца ў больш моцных чэмпіянатах. Ніколі мы ўтрымліваць ня будзем, бо гэта значыць памяншэньне матывацыі. І паралельна мы будзем шукаць пэрспэктыўных футбалістаў для БАТЭ.

**Ці ёсьць прапановы па гульцах ад замежных клюбаў? Vitovt**

Прапановы на шмат каго з гульцоў ёсьць. Мы будзем разглядаць іх пры канцы сэзону, бо трэба максымальна добра выступіць у ЛЧ. Разгляд гэтых пытаньняў цяпер аслабіць каманду, чаго рабіць зусім ня хочацца.

**Віктар, раскажыце калі ласка, пра Вашае дзяцінства ў Хойніках, бацькоў, пра Чарнобыль. З павагай, Антон**

Маю даволі прыемныя ўспаміны дзяцінства. Бацькі зрабілі для мяне ўсё найлепшае, каб дзяцінства прайшло ў самых сьветлых колерах, за што я ім удзячны. Бацькі майго ўжо няма — ён памёр у 1993-м, бо ў першыя дні пасьля аварыі працаваў у Чарнобылі. Мама працавала загадчыцай крамы, цяпер яна жыве ў іншым месцы ў Гомельскай вобласьці.

Бацька прышчапіў любоў да футболу толькі праз тое, што ў савецкія часы, калі па ТБ ішло ўсяго два каналы, ён усіх выганяў, і мы глядзелі футбол. Шкадую, што ён не дажыў да сённяшняга дня, каб парадавацца за свайго сына.

**Ці ёсьць у Вас сям'я, дзеці? Іван Сташэўскі**

Ёсьць любімая жонка і любімае дзіця. Хлопчыку майму 7,5 месяцаў. Гэта мая аддушына, зь ім я забываюся пра футбол.

**А што будзеце рабіць, калі Ваш сын сам захоча стаць футбалістам?**

Гэта ягонае права. Ня буду ні настойваць, ні ўмаўляць, ні падштурхоўваць. Калі захоча, буду рады, а як не, то пастаўлюся з разуменьнем.

**Ці Вы добра разумееце па-беларуску? Юля**

Я нарадзіўся і вырас у Хойніках, дзе мовай была хутчэй трасянка. Але мову вельмі добра разумею. На мой погляд, народ, які забывае сваю мову, ідзе да пагібелі.

**Якімі замежнымі мовамі валодае Віктар Ганчарэнка? Уладзімер**

На жаль, гэта істотная праблема. Неаднакроць у гэтым пераконваўся на стажыроўках, калі трэба было адказваць на інтэрвію. Гэтую праблему пастараюся выправіць. Мая жонка скончыла МДЛУ, мы ўжо трохі прасунуліся. Спадзяюся прасоўвацца па гэтым шляху далей.

**Якімі відамі спорту цікавіцеся? Якія кнігі чытаеце? Якую музыку слухаеце? МТ**

Люблю хакей, біятлён, вялікі тэніс. Цікавіць практычна ўсё. Страшна люблю Формулу-1, дзе мая ўлюбёная каманда «Макларэн». Наконт музыкі — ніякіх перавагаў няма, гэта пад настрой. Кнігі — гэта расейская клясыка. Тое, што не дабраў у школе, цяпер стараюся запоўніць, напрыклад, «Майстар і Маргарыта», «Браты Карамазавы» і г.д.

**Каго зь вялікіх трэнэраў лічыце для сябе прыкладам?**

Я проста ў захапленьні ад Фэргюсана. Столькі гадоў знаходзіцца ля стырна самага тытулаванага клюбу ў сьвеце, сам клюб прагрэсуе, стыль каманды і футбалісты толькі прыбаўляюць. Варта тут жа адзначыць і Арсэна Вэнгэра. Падабаецца тая эпатажнасьць, паводзіны Жазэ Маўрыньню, якія прыцягваюць увагу фанаў, прэсы.

**Ці хацелі б Вы ўзначаліць Нацыянальную зборную Беларусі? Дзед**

Вядома ж, усім нам хочацца працаваць вышэй, дасягаць лепшых вынікаў. Буду толькі рады, калі ў сваёй кар'еры буду ўзначальваць зборную. Пакуль я працую ў БАТЭ, гэтая праца прыносіць задавальненьне.

**Мой сын займаецца футболам у менскай «СДЮШОР-5». Ён мае неблагія здольнасьці і посьпехі. Разьлічвае праз 7—8 гадоў прыйсьці ў БАТЭ. За які замежны клюб заўзялі ў дзяцінстве? Чалавек**

Хлопцу хочацца пажадаць ставіцца да сябе адказна. Калі займацца футболам і дасягаць высокіх вынікаў, трэба шмат у чым сабе адмаўляць. Самае галоўнае, каб ён хацеў гуляць, прысьвячаў сябе футболу. Мне падабаўся стыль і атмасфэра «Манчэстэр Юнайтэд» і заўсёды былі сымпатыі да «Міляну».

**Як Вы ацэньваеце стан фанацкага руху ў Беларусі?**

Магу меркаваць толькі па нашым клюбе. Зьмены ідуць у лепшы бок. Людзі, якія за нас хварэюць, робяць усё магчымае. Думаю, прыйдзем да таго моманту, калі будуць песьні, сьцягі. Песьняў хацелася б, вядома ж. Было прыемна ўжо тое, калі пасьля матчу зь «Леўскім» народ 15 хвілінаў крычаў «БАТЭ!»

# Фэномэн БАТЭ

Чаму БАТЭ ўдаецца тое, чаго не ўдаецца іншым? Чаму з тымі самымі грашыма каманда дасягае болей, чым іншыя? Прычына ў Капскім. Посьпехі БАТЭ ў першую чаргу заснаваныя на дзіўнай аднадушнасьці поглядаў на жыцьцё і футбол кіраўніцтва каманды і трэнераў, якіх Капскі падбірае.



Юлія Дарашкевіч

Ці думалі ў студзені 1996 году маладыя дырэктар фірмы «Сталкер» Анатоль Капскі і малавядомы трэнэр Юры Пунтус, што яны ствараюць самы пасьпяховы футбольны клюб краіны, якому наканавана засланіць колішнія посьпехі менскага «Дынама»? За дзесяць гадоў выступленьня ў найвышэйшай лізе БАТЭ толькі аднойчы застаўся без мэдалёў. Чатыры разы каманда была чэмпіёнам краіны. Аднак толькі пасьля выхаду БАТЭ ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў можна сьмела казаць, што клюб канчаткова вырас з правінцыйнай вопраткі і стаў камандай № 1 у Беларусі.

## Пра назву

БАТЭ носіць імя заводу аўтатрактарнага электраабсталяваньня. Але гэта хутчэй даніна гісторыі. Так звалася самая першая барысаўская каманда, якая ў 1970-я тройчы станавілася чэмпіёнам БССР.

Пасьля ў першай лізе беларускага першынства гуляла барысаўская каманда з загадкавай назвай «Фамальгаўт». У найвышэйшую лігу яна так і ня трапіла, а ў сярэдзіне 1990-х таксама канула ў Лету.

У 1996-м у Барысаве зноў зьявілася каманда, якую Капскі і Пунтус назвалі БАТЭ. Першапачаткова яна ня мела ніякага дачыненьня да заводу. Гэта пазьней Анатоль Капскі стаў дырэктарам прадпрыемства з назвай БАТЭ. Зрэшты, завод па-ранейшаму ня ходзіць у генэральных спонсарах каманды. Яго дапамога — менш за 15 % у гадавым бюджэце каманды. Таму называць барысаўцаў «заводскай» камандай няправільна, таварышы баўтары.

Калі ўжо зайшло пра бюджэты камандаў найвышэйшай лігі, дык БАТЭ тут далёка ня лідэр. Паводле леташніх зьвестак барысаўскі клюб быў на 5-м месцы. Першае займала МТЗ-РІПО, 2-е — менскае «Дынама».

## Посьпехі

Для пераадоленьня адлегласьці ад другой лігі да найвышэйшай БАТЭ спатрэбіўся мінімальны тэрмін — два гады.

Ужо ў дэбютным сэзоне ў найвышэйшай лізе барысаўцы нечакана занялі другое месца. Яшчэ праз год быў здабыты першы чэмпіёнскі тытул. Падобнае змог некалі толькі мазырскі МПКЦ. Хаця, хто сёньня помніць той клюб?

Тым часам барысаўскі стадыён, дбаньнямі Капскага і гарадзкіх уладаў, ператварыўся ва ўтульную пляцоўку, хоць і ня дужа вялікую. На стадыёне ў Барысаве свае матчы праводзіць моладзевая зборная краіны. Дый сам БАТЭ за часамі Пунтуса стаў базавай камандай для «маладзёжкі».

Ад першых гадоў існаваньня каманды належным чынам была пастаўленая праца з моладзьдзю. Менавіта з маек ФК БАТЭ вырасьлі Аляксандар Глеб, Віталь Кутузаў, Васіль Хамутоўскі, Юры Жаўноў, Ягор Філіпенка, Арцём Радзькоў. Гэта ўсё асноўныя гульцы нацыянальнай зборнай Бэрнда Штангэ.

Падчас трэнэрскай працы Юр'я Пунтуса БАТЭ быў адзінай камандай у найвышэйшай лізе, дзе не было легіянэраў. Асабліва і грошы не дазвалялі, дый навошта — калі да 2005 г. каманда пасьпела двойчы стаць чэмпіёнам краіны, чатыры разы заваяваць срэбраныя мэдалі і аднойчы бронзавыя.

Усе гэтыя посьпехі былі магчымыя ў значнай ступені дзякуючы працы Капскага і Пунтуса. Ніводная другая беларуская каманда не магла пахваліцца падобным дружным тандэмам трэнэра і дырэктара.

Пасьля выхаду БАТЭ ў Лігу чэмпіёнаў Капскі проста ахарактарызаваў сваю ролю ў клюбе: «У нас выдатная каманда, трэнэры, спэцыяліст. Галоўнае ў такой сытуацыі — не зашкодзіць».

Дарэчы, Анатоль Капскі адзіны футбольны функцыянэр, які здольны выказвацца супраць старшыні фэдэрацыі футболу і былога кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Генадзя Нявыгласа.

У процівагу БАТЭ пастаянна ставілася менскае «Дынама». Генэральны дырэктар «Дынама» Юры Чыж, блізкі да ўлады бізнэсовец і адзін з найбагацейшых людзей Беларусі, зьмяніў ужо паўтара дзясяткі трэнэраў, а посьпех усё не прыходзіў. БАТЭ ж штампаваў мэдалі.

## Трэнэрскі расаднік

Пры канцы 2004 г. Пунтус вырашыў пакінуць каманду. Трэнэру захацелася зьмяніць абстаноўку — папрацаваць на новым месцы і ўзроўні. Спачатку ён прыняў сталічны МТЗ-РІПА, а праз нейкі час нацыянальную зборную. Што праўда, затрымаўся і там нядоўга.

БАТЭ ж узяў асыстэнт Пунтуса Ігар Крывушэнка. Першы сэзон пад ягоным загадам быў правальны. Упершыню ў гісторыі барысаўцы засталіся без мэдалёў у нацыянальным першынстве. Капскі ня стаў ламаць дроваў: Крывушэнка пасаду захаваў. І ўжо налета прывёў каманду да залатых мэдалёў. Праз год БАТЭ заваяваў чацьверты чэмпіёнскі тытул суверэнных пяршынстваў, прычым задоўга да фінішу.

І тут, у міжсэзоньні, менскае «Дынама» зрабіла Крывушэнку прапанову, ад якой ён ня змог адмовіцца. Лішне казаць, і кіраўніцтва БАТЭ, і заўзятары былі ў шоку. Многія закідалі трэнэру, што ён мог пераходзіць куды заўгодна, але ня ў стан галоўнага антаганіста.

Капскі ж зноў зьдзівіў кадравым рашэньнем. Галоўным трэнэрам стаў 30-гадовы Віктар Ганчарэнка. Наймаладзейшы ў гісторыі беларускага футболу.

Ганчарэнка быў вымушаны скончыць кар'еру футбаліста ў 24 гады, праз цяжкую траўму мэніску. Каманда не пакінула гульца сам-насам з хваробай. Дапамаглі стаць на трэнэрскую сьцежку. Спачатку Ганчарэнка працаваў зь дзецьмі, пасьля яму давэрылі дубль, потым — асыстэнцтва ў галоўнай камандзе, ну і нарэшце — зь лістападу 2007 г. ён стаў галоўным трэнэрам БАТЭ.

Ганчарэнку было ўсяго 29 гадоў, калі ён рэальна быў вымушаны стаць ля стырна БАТЭ — тады інфаркт зваліў Ігара Крывушэнку. Малады спэцыяліст (многія гульцы каманды старэйшыя за яго) з гонарам выканаў пастаўленую задачу — пяць перамог у шасьці гульнях.

Пасьля 21 туру першынства краіны БАТЭ займае другі радок, на адзін пункт саступаючы МТЗ-РІПА Пунтуса і маючы гульню ў запасе. Недзе ўжо далёка ззаду «Дынама» Крывушэнкі.

## Эўракубкі

Першы блін БАТЭ ў эўракубках быў сабаку. Каманду двойчы жорстка біў маскоўскі «Лякаматыў» — 1:7, 0:5. У тое, што гэта было насамрэч, ужо нават ня верыцца.

Праз пару тыдняў па прэзыдэнцкай кампаніі-2001 БАТЭ ў рамках Кубку УЭФА прывозіў у Менск славуты «Мілян», які тады вёў за сабой украінец Андрэй Шаўчэнка. Перамагчы італьянцаў ня выйшла, але па выніку гульняў кантракт зь «Мілянам» падпісаў Віталь Кутузаў.

Яшчэ праз год барысаўцы не пакінулі ніякай надзеі «Мюнхэну-1860», камандзе зь нямецкай Бундэсьлігі.

Летась БАТЭ ўпершыню так блізка падабраўся да штурму групавога турніру Лігі чэмпіёнаў. Выключна на валявых якасьцях была здабытая перамога ў кіпрскага «Апаэля», а потым перамога на клясе ў ісьляндзкага «Хафнаф'ёрдзюра».

Апошнім бар'ерам заставаўся румынскі «Сьцяўа». З камандай легендарнага Георгі Хаджы дома ўдалося згуляць унічыю, а вось у Бухарэсьце саступілі. Хаця, каб фартуна была трошку больш літасьцівая, усё магло быць інакш.

Зрэшты, свайго каманда не папусьціла. Спачатку зноў трапіліся ісьляндцы. Потым БАТЭ даказаў, што ў Беларусі таксама ўмеюць гуляць у футбол двухразоваму ўладальніку Кубку УЭФА, бэльгійскаму «Андэрлехту».

Баўгарскі «Леўскі» ня вынес ніякіх урокаў. Шапказакідальніцкія настроі дамінавалі як сярод гульцоў, балельшчыкаў, так і трэнэраў каманды. Як толькі не называлі БАТЭ — і «калгасьнікамі», і «заводзкай камандай з штучна створанай дзяржавы». Вось і атрымалі ўрок беларускай гісторыі яшчэ ў Сафіі.

А падчас другой гульні, калі Сяргей Сасноўскі адкрыў лік, сумневаў, што БАТЭ даб'ецца выхаду ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў, не засталася. Нават выдаленьне Блізьнюка і гол Гаджава ня зьменшылі гэтай веры. Барысаўцы мусілі датрымаць да канца, выйсьці з гонарам з такой цяжкой сытуацыі. Гэтага патрабавала драматычнасьць моманту. Як у галівудзкіх баевіках, калі галоўны герой насуперак усяму дабіваецца мэты.

І калі пасьля фінальнага сьвістка рукі ўгору ўскінуў 19-гадовы брамнік Аляксандар Гутар, прыйшло ўсьведамленьне: «Мы гэта зрабілі»! Фатаздымкі шчасьлівага Капскага, які за час станаўленьня клюбу перажыў некалькі апэрацый на сэрцы, сьведчаць, наколькі важная гэтая перамога, як для яго асабіста, так і для ўсёй краіны.

Гэта найбольшы посьпех беларускага футболу за 17 гадоў незалежнасьці. Барысаў амаль да раніцы сьвяткаваў посьпех землякоў.

## Каманда ўсяе Беларусі

Характэрна, што пасьля гэтага посьпеху свае віншаваньні камандзе Ганчарэнкі выказалі ўсе клюбы краіны. БАТЭ перастаў належаць толькі Барысаву. У матчах Лігі чэмпіёнаў каманду падтрымаюць заўзятары ўсіх беларускіх клюбаў. Лёсаваньне распарадзілася так, што ў госьці да БАТЭ ў Менск прыедуць (услухайцеся толькі!) мадрыдзкі «Рэал», турынскі «Ювэнтус», піцерскі «Зэніт». Каманды, ад назваў якіх перахоплівае дых у заўзятара. Ганчарэнка ж кажа, што ў ягоным слоўнікавым запасе няма слова «пройгрыш». А яшчэ ён абяцае перамагчы «Рэал»...

Як бы там ні было, нас чакае шыкоўная футбольная восень. Нічога падобнага ў нас раней і блізка не здаралася. Прапускаць такое недаравальна!

**Зьміцер Панкавец**

## Беларускія пілігрымы наведалі месца пахаваньня сьв. Язафата Кунцэвіча

**Асоба грэцка-каталіцкага арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча ў беларускай гістарыяграфіі зьяўляецца супярэчлівай.** Праваслаўныя лічаць яго ворагам, які зьдзекваўся зь людзей. Каталікі, наадварот, абвясьцілі яго сьвятым і прызналі апекуном створанай у 1999 г. Віцебскай дыяцэзіі. Бясспрэчна адно — Язафат Кунцэвіч не пашкадаваў нават уласнага жыцьця дзеля аднаўленьня еднасьці хрысьціянаў.

Сёлета мне пашанцавала пабываць у пілігрымцы да месца пахаваньня сьвятога Язафата Кунцэвіча ў Рыме, якую арганізаваў ксёндз з Расонаў Вячаслаў Барок. Не хапае словаў, каб перадаць уражаньні ад пілігрымкі, асабліва ад таго яе моманту, калі мы мелі магчымасьць узяць удзел у набажэнстве ў галоўным храме каталікоў сьвету — саборы Сьв.Пятра і памаліцца ля срэбнай труны з парэшткамі сьвятога Язафата.

Ксёндз Вячаслаў Барок выказаў шкадаваньне, што парэшткі сьвятога, які ўсё жыцьцё працаваў у Беларусі знаходзяцца ў Ватыкане. Напэўна, было б больш справядлівым, калі б яны былі пахаваныя на ягонай радзіме, і ўсе нашыя вернікі мелі б магчымасьць доступу да іх. Але трэба адзначыць, што ў Мёрскай парафіі сёньня захоўваецца рэліквіярый з мошчамі сьвятога Язафата, які быў туды перададзены ў 2004 г.

Ягоная постаць у гістарычнай літаратуры падаецца ня ў самых сьветлых колерах. Маўляў, быў нецярплівы, не шкадуючы сябе, не шкадаваў і іншых. Вобраз сьв.Язафата, створаны Ўладзімерам Караткевічам у п’есе «Званы Віцебска», падаецца мне шмат у чым далёкім ад рэальнага. Язафат Кунцэвіч памёр пакутніцкай сьмерцю за тое, каб у каталікоў і праваслаўных была адна царква, адна вера. Ён, як ніхто іншы, ужо тады разумеў, які вялікі і страшны грэх падзелу Хрыстовага Цела, якім, паводле хрысьціянскага вучэньня, зьяўляецца Царква. Унія, што па Божым провідзе была заключаная на беларускай зямлі ў 1596 годзе, на нейкі час зноў прынесла еднасьць хрысціянам. Разьвіцьцё Уніі ў Беларусі на пачатку XVII ст. і зьвязанае менавіта зь імем Кунцэвіча. Ён быў яе сынам, дзеячам, пакутнікам і сьвятым.

...Халодным лістападаўскім днём у 1990 годзе маладыя грэка-каталікі на чале з айцом Себасцьянам паспрабавалі ўстанавіць крыж на дзьвінскім беразе ў Віцебску, адкуль калісьці скінулі нежывое цела арцыбіскупа. Яны пранесьлі па віцебскіх вуліцах крыж і абразок з выяваю сьвятога Язафата, а калі пачалі асьвячэньне крыжа на Ўсьпенскай горцы, трапяткую людзкую узьнёсласьць парушыла зьяўленьне міліцыянэраў. Тыя, выконваючы загад гарадзкіх уладаў, перашкодзілі ставіць крыж. Праз год крыж у гонар сьвятога Язафата Кунцэвіча быў усё-такі пастаўлены, але ўначы таямніча зьнік...

Тым, хто аб гэтым ведае, хто разумее, наколькі цяжкі і цярністы быў шлях Царквы на нашай зямлі, тым, хто разумее, што такое Беларусь калісьці, учора і сёньня, — няхай дадасца сілы, любові і адвагі.

**Кацярына Церашкова, Наваполацак**

* * *

Калі народзіцца ён?
Ці ўжо ёсьць сярод нас?
Той, хто на плошчы «ня скажа пас».
Той, хто ня кіне людзей у бядзе,
хто да свабоды народ павядзе.
Дай жа нам, Божа, лепшае долі,
моцнага духу, жалезнае волі.
Дай жа нам збаўцу, ня стой убаку,
прагі да волі дай мне, мужыку.

**Кастусь**

## Інфармацыя для студэнтаў

У 2009 г. Міжнародны Вышаградзкі Фонд рэалізуе спэцыяльную праграму для Беларусі. Праграма прапаноўвае беларускім студэнтам і навукоўцам 80 сэмэстраў навучаньня ў любым дзяржаўным ці прыватным унівэрсытэце краін-удзельнікаў Вышаградзкай Групы (Вугоршчына, Польшча, Славакія, Чэхія). Кожны ахвотны можа падаць заяўку на ўдзел у адукацыйных праграмах Master’s ці Post-Master’s (асьпірантура) тэрмінам ад 1 да 4 сэмэстраў. Дадатковая інфармацыя на www.visegradfund.org/scholarships.htm

Міжнародны Вышэградзкі Фонд быў заснаваны ў 2000 годзе ў якасьці адзінай інстытуцыі Вышаградзкай Групы, місіяй якога было фінансаваньне розных праектаў у галіне культуры, адукацыі, навуковага абмену, абмену моладзьдзю, прымежнага супрацоўніцтва і папулярызаваньня турызму. Галоўнымі ўдзельнікамі грантавых праграм зьяўляюцца няўрадавыя некамэрцыйныя арганізацыі, муніцыпалітэты і асобныя грамадзяне.

**ВОДГУК**

## «Полацак–Пскоў: апошняя чыгунка Імпэрыі» («НН». № 32)

Сапраўды, чыгунка Полацак–Ідрыца–Пскоў–Гдоў была збудаваная недзе ў 1915—1916 гг., а рух па ёй распачаўся, пэўна, толькі ў 1917 годзе. Шмат падрабязнасьцяў, пэўна мог бы ў свой час распавесьці Янка Купала, які зь лета 1916 да восені 1917 служыў у вайсковым дарожна-будаўнічым аддзеле на станцыі Баравуха (пад Полацкам).

Прынцыповай адметнасьцю новае чыгункі было тое, што будавалася яна з увагі не на эканамічныя патрэбы, але на рэаліі ваеннага часу. Чыгунка адносілася да катэгорыі ракадных, то бок ішла ўздоўж франтавой лініі і скарыстоўвалася для хуткай перадысьлякацыі войскаў.

Пасьля Першае сусьветнае вайны паўсталі новыя незалежныя краіны Эстонія, Латвія, Польшча, і для савецкага кіраўніцтва існаваньне чыгункі было апраўданае палітычнымі патрэбамі. Яе ў 1920—1930-я, пэўна, скарыстоўвалі для забесьпячэньня ўмацаванае «лініі Сталіна», а пазьней у «вызваленчым» паходзе 1939 г.

У часе Другое сусьветнае вайны чыгунка скарыстоўвалася нямецкімі карнымі часткамі. У 1942—1943 гг., калі верыць рэляцыям камадзіраў партызанскіх аддзелаў, на лініі Пскоў–Полацак імі было пашкоджана каля 1500 рэек. Аднак ёсьць зьвесткі, што ў сакавіку 1944 г. нямецкія бронецягнікі Pz 51 і Pz 67 займаліся інтэнсіўным патруляваньнем гэтае лініі, і значыць чыгунка была ў добрым стане.

Па сканчэньні вайны мяжа адсунулася далёка на захад. Яшчэ раней у выніку адміністрацыйных падзелаў вёскі Выдрыца (Ідрыца), Нішча, Галузіна былі з тэрыторыяй былога Себескага павету забраныя да РСФСР. Таму патрэбы ў чыгунцы, асабліва адцінку Полацак—Ідрыца, не было, і яе аднаўляць ня сталі. Быў адноўлены толькі адзін адцінак чыгункі: выезд з станцыі «Полацак 1» да былога камбінату будаўнічых матэрыялаў. Працягласьць яго блізу 2,4 км і прызначаны ён быў для вывазу гатовае цэглы з камбінату. Пасьля ліквідацыі пры канцы 1990-х камбінату, зьнікла патрэба і ў чыгунцы.

З прычыны недагляду стан яе стаў пагаршацца: пагнілі шпалы, зьнялі лінію асьвятленьня ўздоўж чыгункі, уладальнікі катэджаў дэмантавалі некалькі рэек, каб забясьпечыць сваім машынам праезд да пабудоваў. Але захаваўся пазначаны на мапе 1937 году масток (хаця і перабудаваны) і хата былога блёк-паста №5, якая сёньня скарыстоўваецца пад прыватнае жытло.

Хто лянуецца або ня можа далёка падарожнічаць, здолее аўтобусам даехаць ад цэнтру Полацку да прыпынку «Вуліца Шміта», а потым, прайшоўшы ў левы бок па вуліцы Шміта 500 мэтраў, дайсьці да пераезду праз тую чыгунку.

**Міхась Баўтовіч, Полацак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Як чужыя рэчы ў хаце

Што важней — уцяпліць будынкі ці захаваць архітэктурную спадчыну. Піша архітэктар Ігар Байцоў.

Сёньня ў нас пануе такое стаўленьне да ўсяго, што захавалася з раней пабудаванага, як да нейкіх чужых ужываных некаштоўных рэчаў у хаце — пакінутых пажыткаў раптоўна зьехаўшых папярэдніх жыхароў. У пераважнай большасьці з тых, хто мяняе аблічча беларускіх гарадоў, як і ў наіўных навасёлаў, гэтыя «чужыя рэчы» не выклікаюць ніякіх прыемных успамінаў і асацыяцый, не нясуць у сабе ніякай станоўчай сымболікі. Таму наяўныя пабудовы са спакойнай душою зьнішчаюць, замяняючы на новыя — ужо свае. Калі ж час зьнішчыць яшчэ не надышоў, то іх перарабляюць ці хоць бы перафарбоўваюць, зьмяняючы іх аблічча на новы лад. Яскравых прыкладаў таму процьма. Вось толькі адзін зь іх.

### Дом, якому не пашанцавала

Вуліцу Ўльянаўскую ў Менску ўпрыгожвае вялікі жылы дом №4. Гэты дом выдатнай архітэктуры пабудаваны перад вайною паводле праекту дойліда Р.Столера. Эфэктна разьмешчаны на пагорку, ён цешыў вока і агульнай кампазыцыяй аб’ёмаў, і майстэрскай дэталіроўкай фасадаў, і ўдалай, нестандартнай афарбоўкай з ружовым адценьнем. Гэта была безумоўная архітэктурная адметнасьць усёй прылеглай часткі Менску — адзін зь яскравых складнікаў «Гораду Сонца» Артура Клінава.

Але дому №4 не пашанцавала. У красавіку гэтага году я літаральна здранцьвеў, калі ўбачыў, што на яго галоўны фасад пачалі ляпіць пенаполістырольныя пліты цеплаізаляцыі, хаваючы пад імі рустоўкі, каштоўныя дэталі і фактуры, зьнішчаючы высакаякаснае архітэктурнае аблічча. Не хацелася верыць уласным вачам. Як магло такое адбыцца? Праз пэўны час работы прыпыніліся, і большая частка галоўнага фасаду пакуль што застаецца ў некранутым выглядзе. Фатаздымкі ў газэце ня ў стане перадаць усёй прыгажосьці будынку і катастрафічнасьць шкоды, якую яму пачалі наносіць. Гэта трэба бачыць на свае вочы.

Мне ўдалося дазнацца, што дом №4 чамусьці не знаходзіцца ў сьпісе гістарычна-культурных каштоўнасьцяў, а ўцяпленьне фасадаў вядзецца паводле праекту ААТ «Белкомплекспраект», ня ўзгодненым у Камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Менгарвыканкаму, хоць гэта і патрабуецца. У дадзеным выпадку відавочна для многіх, што адбываецца яўны акт вандалізму, але яшчэ ёсьць магчымасьць вярнуць галоўныя фасады да першапачатковага выгляду. Зусім няцяжка занесьці гэты будынак у сьпіс гістарычна-культурных каштоўнасьцяў. Хацелася б, каб гэты крок у цывілізаваным кірунку адбыўся. Але гэты выпадак — не адзінкавае здарэньне.

### Спадчына і энэргазьбераганьне

У краіне распачатая і актыўна ажыцьцяўляецца вельмі важная праграма па энэргазьбераганьні. Але нарматыўная база і практыка яе ажыцьцяўленьня надта недасканалыя ў адносінах да архітэктурнай спадчыны, нават і той яе невялікай часткі, што ўвайшла ў афіцыйны сьпіс гістарычна-культурных каштоўнасьцяў.

Чытаем будаўнічыя нормы па рамонце, рэканструкцыі і рэстаўрацыі жылых і грамадзкіх будынкаў БНБ 1.04.02-02, пункт 5.34. У ім гаворыцца: «Для будынкаў, што маюць высакаякасную даўгавечную аддзелку або высакаякасны ляпны дэкор на фасадах, вонкавую цеплавую ізаляцыю дапускаецца не выконваць». Фармулёўка двухсэнсоўная. Тым, хто абыякава ставіцца да архітэктурнай спадчыны, яна, па сутнасьці, дазваляе гэтую ізаляцыю выконваць на ўсіх будынках, нават гістарычна-культурных каштоўнасьцях, бо нарматыўны дакумэнт датычыць і рэстаўрацыі. Каб уратаваць архітэктурнае аблічча будынку ад зьнявечаньня ў такіх умовах, у кожным выпадку нехта павінен з сваёй ініцыятывы стаць яго абаронцам. Але ў дадзеным выпадку нават сярод архітэктараў такіх абаронцаў не знайшлося ані ў праектнай арганізацыі ААТ «Белкомплекспраект», ані ў архітэктурнай службе Ленінскага раёну, якая ўзгадніла праект, ані ў экспэртызе, якая дала пра яго станоўчае заключэньне. Не знаходзіцца іх і ў многіх іншых падобных выпадках па ўсёй краіне.

### Каштоўнасці бяз шыльдачак

Ня многія ў нас пакуль што разумеюць, што архітэктурная спадчына — гэта ня толькі дамы з ахоўнымі шыльдачкамі «гістарычна-культурная каштоўнасьць» на фасадзе. Намнога большы масіў рукатворнага асяродзьдзя годны пашаны і патрабуе яе. На практыцы ж стала «культурнай нормай» зьняважлівае стаўленьне да ўсяго зробленага раней. Гэта вядзе да культурна-эстэтычнай дэградацыі асяродзьдзя і штурхае народ да гістарычнага бяспамяцтва.

### Неакрэсьленая фармулёўка

Калі прыглядзецца, няцяжка ўбачыць, што і ахоўныя шыльдачкі недастаткова бароняць ад скажэньня гістарычнага аблічча. Яны паведамляюць, што «прычыненьне шкоды караецца па законе», але на самай справе на будынках, якія фармальна знаходзяцца пад аховай, зьяўляецца ўсё болей і болей антыгістарычных зьмяненьняў: выкарыстоўваецца мэталадахоўка, плястыкавыя вокны, сучасныя вадасьцёкавыя трубы, не адпаведныя гістарычнаму выгляду казыркі, ганкі, абліцоўкі і колеры афарбоўкі. Усё гэта адбываецца і пры наяўнасьці навуковых кіраўнікоў, прызначаных на такія аб’екты.

Упраўленьне па ахове гістарычна-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры дэманструе нязьдольнасьць супрацьстаяць гэтай стыхійнай зьяве. Думаецца, тут вялікую шкоду прыносіць тое, што ў Законе Рэспублікі Беларусі «Аб ахове гістарычна-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» не вызначана, што ж канкрэтна прычыненьнем шкоды трэба лічыць. Мноству людзей не прыйдзе да галавы, напрыклад, што прыхарошваньне старой пабудовы сучаснымі моднымі матэрыяламі — нешта дрэннае і «караецца па закону». Для іх паняцьце «прычыненьне шкоды» абмяжоўваецца фізычнымі пашкоджаньнямі накшталт адбітага кавалку цэглы ці падрапанага тынку. Таму і Закон наш гэты, і іншыя нарматыўныя дакумэнты па згаданых пытаньнях, і тэкст на ахоўных шыльдачках патрабуюць удасканаленьня.

### Праектоўшчыкі і дойліды

Двухсэнсоўнасьць і неакрэсьленасьць фармулёвак прававых дакумэнтаў дазваляе тым, хто не шануе нашай спадчыны, удзельнічаць у яе разбурэньні і зьнявечаньні, але і дае магчымасьць тым, хто разумее і адчувае яе каштоўнасьць, а такія яшчэ ёсьць, усё ж гэтую спадчыну абараняць і зьберагаць, хоць і зь вялікімі цяжкасьцямі. На жаль, такую магчымасьць выкарастоўваюць далёка ня ўсе. У якія рукі трапяць наступныя падобныя аб’екты? Да адданых справе дойлідаў — годных нашчадкаў нашай спадчыны, ці да абыякавых праектоўшчыкаў? Лёс гуляе з нашай спадчынай у лятарэю.

# Цуды ў Лучаі

Мястэчка Лучай на Пастаўшчыне — адзін з найпрыгажэйшых куткоў Паазер'я. Як і паўсюдна тут — і ў Лучаі ёсьць сваё вялікае возера й тузін драбнейшых. Як і паўсюдна ў заходніх мястэчках — тузін міжваенных мураванак, брук пад хатамі й закінуты парк. Але тутэйшы касьцёл Сьвятога апостала Юды Тадэвуша сваім гмахам, дасканалай архітэктураю й пекным убраньнем пераўзыходзіць сотні іншых храмаў...



СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

Гэтую сьвятыню фундавала ў 1766 г. Альжбэта Пузыня з роду Агінскіх. А ў 1776 г. касьцёл быў дабудаваны дабрадзеем Тадэвушам Агінскім. Гэтак паўстаў унікальны манумэнтальны храм у стылі позьняга барока з рысамі новага стылю — францускага клясыцызму. Убраньне касьцёла таксама ня мае аналягаў у Беларусі. Перадусім, дзякуючы фрэскам XVIII ст., выкананым у тэхніцы грызайль, што імітуе скульптуру. На гэтых фрэсках, нібы выразаных з вохрыстага каменю, паўстаюць сцэны са Сьвятога Пісьма і з... жывой гісторыі Лучаю. Вось — заручыны шляхцюкоў з паненкамі, вось — хрост дзіцяці, чые шчасьлівыя бацькі, у строях паводле моды трохсотгадовае даўніны, дабравейна схіліліся над купельлю, вось — шляхта зь сялянамі на імшы, сапраўдная энцыкляпэдыя тутэйшага жыцьця, жывыя народныя тыпажы, якім невядомыя мастакі XVIII стагодзьдзя далі жыцьцё вечнае.

Напярэдадні прыходу Вялікай Арміі Напалеона, у 1811 г., у касьцёле быў усталяваны арган, што цудам ацалеў і сёньня спраўна служыць падчас багаслужбаў і канцэртаў.

Пасьля прыходу савецкае ўлады сьвятыня ў Лучаі падзяліла лёс многіх іншых храмаў у Беларусі — у 1946 годзе касьцёл зачынілі, а ксяндзоў пагналі ў Сібір. Шэдэўр архітэктуры пераўтварылі ў сховішча збожжа. Сёньня ў такое цяжка паверыць.

А цяпер парафія ў Лучаі атрымала сусьветную вядомасьць. 15 чэрвеня тут адбылося высьвячэньне першага ў сьвеце помніка Сьвятому Айцу Бэнэдыкту XVI.

Помнік Пантыфіку быў усталяваны перад касьцёлам у Лучаі да візыту ў Беларусь Дзяржаўнага сакратара Ватыкану кардынала Тарчызіё Бэртонэ. Гэтая падзея — прыклад насамрэч народнае дыпламатыі, што дасьць плёну болей, чым высілкі чынавенства. Дый для вобразу Беларусі ў сьвеце гэта ўсьцешны дадатак. Пакуль толькі ў баварскім мястэчку Траўнштайн ушанавалі Бэнэдыкта XVI — там усталяваны ягоны бюст. З блаславеньня біскупа Віцебскае дыяцэзіі Ўладзіслава Бліна грошы на помнік ахвяраваў ксёндз Мікалай Ліпскі, пробашч лучайскага касцёла. Дзеля гэткае справы ён прадаў уласнае аўто. Помнік, у духу сацрэалізму, стварыў скульптар зь Менску, прафэсар Леў Аганаў, які ўжо рабіў скульптурныя кампазыцыі на замову іншых прафіяў, у тым ліку й для Мосару.

Не пасьпеў кардынал Тарчызіё Бэртонэ вярнуцца ў Ватыкан, а сьвятому айцу ўжо быў прадстаўлены дыхтоўны альбом з фатаздымкамі ўрачыстае цырымоніі адкрыцьця помніка й зь відамі лучайскіх ваколіцаў. Ксёндз Мікалай, да ўсяго, выдатны фатограф. Ён можа, кінуўшы касіць, пабегчы па апарат, каб зьняць вясёлку над Лучаем, праляцець на верталёце, каб зьняць разлогі Лучайскага возера, ці пільнаваць малінавы захад над сваім касьцёлам...



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Ксёндз Мікалай плянуе зрабіць у мястэчку музэй, скарыстаўшы стародаўнюю жыдоўскую камянічку, і рупіцца ўжо цяпер, каб дастаць дзе сапраўднае драўлянае гонты. Таксама плянуе набыць фігуры 12 апосталаў, зрабіць скульптурную галерэю на матывы Сьвятое гісторыі...

На жаль, тымчасам жыцьцё ў мястэчку пакрысе гасьне. Моладзі засталося вобмаль. У былой касьцёльнай плябані сёньня базавая школа. Ксёндз Мікалай, аднак, не прысьпешвае справу яе вяртаньня... Сёньня ў лучайскай школе 24 вучні й 16 настаўнікаў. Калі закрыюць і гэтую школу, будучыня і Лучаю, і касьцельнае грамады стане зусім няпэўнай. Спадзеў пробашча — на турыстаў і дабрадзеяў-фундатараў. Але, перадусім, на Бога. Калі цуд вяртаньня й адраджэньня сьвятыні адбыўся, то пэўна, мусіць стацца й новы цуд — адраджэньня Лучаю ды ўсяго нашага Паазер'я.

**Сяргей Харэўскі**

**Лучай**

вёска ў Навасёлкаўскім сельсавеце Пастаўскага раёну Віцебскай вобл. За 18 км ад гораду і чыг.ст. Паставы, 268 ад Віцебску. 253 жыхары, 92 двары (паводле стану на 1999).

Вядомая з 1542 як уладаньне Забярэзінскіх. З канца XVI ст. — мястэчка. Мёнтак Лучай належаў Юндзілам, Глябовічам, Шэметам і інш. З 1617 — уладаньне Рудамінаў, з 1731 — Агінскіх. У 1766—1776 у Лучы пабудаваны мураваны езуіцкі касьцёл. З 1793 — у Рас. імпэрыі, цэнтар валасьці ў Вілейскім павеце. У 1905 у сяле і маёнтку Лучай 81 жыхар, народная вучэльня, валаснoе праўленьне, крама. З 1921 Лучай у складзе Польшчы, мястэчка, цэнтар гміны ў Пастаўскім павеце Віленскага ваяводзтва. З 1939 — у БССР.

Базавая школа, бібліятэка, камбінат бытавога абслугоўваньня, аддзяленьне сувязі. Помнік архітэктуры — Лучайскі касьцёл езуітаў (1776).

**«БелЭн»**



У Галяндыі выходзіць новы дыск беларускага піяніста Віталя Стахіевіча з трыма санатамі Пракоф'ева. Ці траціць клясычная музыка папулярнасьць у сьвеце? Як пачуваецца і на што можа разьлічваць беларускі музыка на Захадзе? Зь Віталём Стахіевічам гутарыць Наталка Бабіна.




# Віталь Стахіевіч: На Захадзе цябе разглядаюць як поп-зорку

**«Наша Ніва»: Вы стала жывяце ў Галяндыі, ці не ўзьнікала жаданьня ампутаваць нацыянальнасьць, як гэта хочацца зрабіць Еве Вежнавец?**

**Віталь Стахіевіч:** Для мяне гэта важнае пытаньне. Цяпер, калі папулярныя ідэі ўяўных ідэнтычнасьцяў, калі паўсюдна адмаўляюцца ад нацыянальных асаблівасьцяў, я, магчыма, выглядаю старамодным. Для мяне карані, мая нацыянальнасьць вельмі важныя. Яна мае ўплыў на тое, што я раблю. Працуючы над санатамі Пракоф'ева для дыску, я зразумеў, наколькі нацыянальная ідэнтычнасьць была важная для гэтага кампазытара: ён быў касмапалітам, унівэрсальным музыкам, тым ня менш, не адыходзіў ад расейскай музычнай традыцыі... Менавіта праз гэта ён вярнуўся з эміграцыі ў сталінскую Расею, дзе ягоную жонку забяруць у лягер, дзе яго будуць крытыкаваць ва ўсіх газэтах — але ён ня мог не вярнуцца.

**«НН»: Як Вы бачыце сваю будучыню? Вас таксама цягне ў Менск, як Пракоф'ева ў Маскву, ці цяпер можна жыць у Амстэрдаме і адчуваць сябе паўнавартасным беларусам?**

**ВС:** Цяпер не такая драматычная сытуацыя. Сёньня можна падарожнічаць без праблемаў у рэальнай і віртуальнай прасторы. Мяне заўсёды інтрыгуе такі панятак, як паралельнасьць часу. Калі падарожнічаеш, вельмі выразна адчуваеш гэтыя незьлічоныя плыні часу, і тое, што толькі адзінкавыя зь іх рэалізаваныя. Музыка — мастацтва, якое найбольш шчыльна судакранаецца з гэтымі плынямі часу. Магчымасьць падарожнічаць у часе, рэальна падарожнічаць — гэта мая мара.

**«НН»: Геніяльны спадар Айнштайн давёў, што гэта магчыма.**

**ВС:** Геніяльныя кампазытары таксама даводзяць, што гэта магчыма. Музыка існуе ў часе, але і па-за ім таксама. Кожны выканаўца можа ўкласьці ў музыку тое, чым ён жыве цяпер, — і ўвайсьці ў плынь таго часу, той сьвядомасьці, якая была ў часы кампазытара, твор якога ён выконвае.

**«НН»: Што Вы ўкладаеце ў музыку, якую выконваеце?**

**ВС:** Мне хочацца мінімізаваць вонкавыя эфэкты. Мне ня хочацца сваёй постацьцю замінаць успрыманьню музыкі. Хочацца, каб публіка была менавіта слухачамі, а не гледачамі. Задача піяніста — уважліва глядзець у ноты. Якую задуму меў кампазытар? А скакаць над клявішамі, як малпа, — гэта непатрэбна.

**«НН»: Параўнайце гледачоў тут і ў іншых краінах.**

**ВС:** На Захадзе публіка расьпешчаная: усё ведае, усіх чула. У яе спажывецкі падыход: падабаецца — не падабаецца, яны ставяцца да артыста як да тавару. Папулярнасьць клясычнай музыкі падае. Спажывецкае грамадзтва вольнае выбіраць тое, што яму падабаецца, і часта гэта не ідзе на карысьць мастацтву. Ты выходзіш на сцэну, і цябе разглядаюць як поп-зорку. Як ты выглядаеш, як сябе паводзіш. Але ж гэта мае ўскоснае дачыненьне да музыкі. Зь іншага боку, заходняя публіка вельмі адукаваная, яна можа параўнаць цябе з самымі выдатнымі выканаўцамі. Мне падабаецца выступаць у невялікіх гарадках, у тым ліку і ў Беларусі. Берасьцейскія гледачы падаюцца асабліва цёплымі.

**«НН»: Вы кажаце, што клясычная музыка страчвае папулярнасьць. Але ж у часы Бэтховэна, канцэрты якога Вы граеце, ягоная музыка была даступная толькі эліце, а цяпер яго слухае шырокае кола людзей.**

**ВС:** Артэга-і-Гасэт пісаў, што ў XX ст. паняцьце элітарнасьці мастацтва ўжо зьнівэлявалася. Мы ня можам ведаць, як там было ў часы Бэтховэна насамрэч, мы можам толькі мадэляваць гэтую сытуацыю. Але ж дакладна, што ў ягоныя часы ягоная музыка не была даступная столькім людзям, як цяпер. Аднак сёньня выбар публікі ўсё радзей бывае на карысьць клясыкі.

**«НН»: Ці можаце Вы ацаніць стан канцэртнага жыцьця ў Беларусі?**

**ВС:** У параўнаньні з савецкімі часамі канцэртнае жыцьцё здрабнела. Тады ў Беларусь часьцей прыяжджалі вядомыя выканаўцы. Цяпер мы больш варымся ў сваім соку.

**«НН»: Але нястача грошай не замінае запрасіць якога Кіркорава, пры гэтым на такім канцэрце будзе прысутнічаць Лукашэнка. Нешта не магу ўявіць яго ў залі кансэрваторыі.**

**ВС:** Але Лукашэнку цалкам магчыма пабачыць у залі опэрнага тэатру.

**«НН»: Так? Ён любіць опэру?**

**ВС:** Ці любіць, ня ведаю, але ён наведваў опэру і балеты. Таму я не ацэньваў бы так адназначна. Іншая рэч, што раней у гісторыі нашай краіны былі сытуацыі, калі ў насельніцтва на ўзроўні дзяржавы нейкім, можа, ненатуральным чынам фармаваліся больш высокія густы. Але гэта выключэньні. Так што цяпер у Беларусі ўсё адбываецца натуральна. Проста павінен быць выбар, што слухаць, і тады ўсё будзе натуральна, жыцьцё само расставіць акцэнты.

**«НН»: Ці існуе цяпер на Захадзе падтрымка дзяржавай той ці іншай музыкі?**

**ВС:** У некаторай ступені ёсьць. Такую падтрымку атрымліваюць найбольш каштоўныя, найбольш вядомыя музычныя калектывы, але падтрымка гэтая невялікая. У прынцыпе ж усё рэгулюецца рынкам.

**«НН»: Якой музыцы Вы аддаяце перавагу як выканаўца і як слухач?**

**ВС:** Музыцы рамантычнага складу. Але граю і Гайдна, і Моцарта, і сучасную музыку. І слухаю ў асноўным таксама акадэмічную музыку.

**«НН»: Дзе Вас могуць пачуць жыхары Беларусі?**

**ВС:** Кожны год я граю ў менскай Філярмоніі. Можна пачуць мяне і на маім сайце: www.stahievitch.com.

**«НН»: Ці прыносіць матэрыяльны прыбытак Вашая музычная дзейнасьць?**

**ВС:** Так, толькі зь яе і жыву. Пакуль гэтае жыцьцё досыць сьціплае, але, спадзяюся, з ростам прафэсійнага майстэрства і я пабагацею (*сьмяецца*).



**Віталь Стахіевіч**

нарадзіўся ў Менску. Музычную адукацыю атрымаў у Менскай ды Амстэрдамскай кансэрваторыях, бязьмерна ўдзячны сваёй настаўніцы прафэсару Зоі Качарскай. Жыве ў Амстэрдаме і выступае з канцэртамі па ўсім сьвеце. Цудоўна гаворыць па–беларуску дзякуючы палескім караням і сьвядомаму выбару, зробленаму ў сталым узросьце.

## Маккейн выбраў жанчыну

Кандыдат у прэзыдэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Джон Маккейн пойдзе на выбары з губэрнатарам Аляскі Сарай Пэйлін. 44-гадовая Пэйлін стала губэрнатарам Аляскі два гады таму. Яна на тры гады маладзейшая за Абаму. Гэтае прызначэньне стала для многіх нечаканасьцю. Сара Пэйлін трымаецца кансэрватыўных поглядаў: яна выступае супраць абортаў і зьяўляецца чальцом Нацыянальнай стралковай асацыяцыі. Пэйлін замужам, мае пяцёра дзяцей. Апошні нарадзіўся ў красавіку гэтага году, ён пакутуе на сіндром Даўна. Яшчэ да нараджэньня дзіцяці Пэйлін ведала, пра тое, што ў яго будзе сіндром Даўна, аднак адмовілася ад аборту. Да свайго губэрнатарства місіс Пэйлін была мэрам маленькага гарадка непадалёк ад Анкорыджу. Сама вырасла там, выбіралася там каралевай прыгажосьці і да гэтага часу жыве ў гэтым гарадку.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**1 верасьня прайшлі школьныя лінейкі. На фота: дзеці ідуць у беларускамоўную 23-ю гімназію ў сталіцы.**

## Расея пачынае эканамічную вайну з Украінай

Першы віцэ-прэм'ер Ігар Шувалаў даў даручэньне забясьпечыць абарону расейскага рынку ў сувязі з уступленьнем Украіны ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю. Даручэньне прадугледжвае захады фітасанітарнага характару і вэтэрынарнага кантролю, а таксама другіх захадаў у сфэры вытворчасьці і продажу тавараў і паслуг прамысловага і сельскагаспадарчага прызначэньня.

## У Латвіі могуць спыніць рэтрансьляцыю расейскіх каналаў

З прапановай забараніць трансьляцыю расейскіх тэлеканалаў выступіла намесьнік кіраўніка Нацыянальнага савета па радыё і тэлебачаньні Даце Буцініеце. Гэтыя захады будуць хутчэй сымбалічныя, паколькі ніхто не забароніць грамадзянам Латвіі глядзець спадарожнікавае тэлебачаньне.

## Каталікі распачалі пост за вяртаньне Сьвятога Язэпа

У Менску 27 прадстаўнікоў парафіі Сьвятога Язэпа пачалі бестэрміновы пост за вяртаньне вернікам будынкаў кляштару бернардынаў з касьцёлам. У 2007 г. пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртаньне кляштару вернікам было сабрана больш за 30 тысяч подпісаў. Як стала вядома БелаПАН з кампетэнтных крыніц, 20 чэрвеня ў Менску на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам кардынал Тарчызіэ Бэртонэ не атрымаў станоўчага адказу на пытаньне аб вяртаньні вернікам будынкаў.

## Лібія праходзіць да дэмакратыі

Лібія зьбіраецца будаваць дэмакратыю і капіталізм. Лідэр краіны Муамар Кадафі хваліць перавагі прыватызацыі. Лібійскі лідэр заявіў, напрыклад, што «грамадства пераацэніць сябе новым, дэмакратычным чынам». Рэформа мае ажыцьцявіцца за чатыры месяцы.

Пляны рэформаў, якія абнародаваў Муамар Кадафі, па сутнасьці ёсьць увасабленьнем заклікаў, зь якімі выступаў ягоны сын Саіф Ісламу Кадафі. У жніўні ён абвясьціў пра спыненьне палітычнай кар'еры, але да гэтага выступіў з прапановай пра рэформы ў галіне эканомікі і дзяржаўнага кіраваньня.

Днямі краіна падпісала пагадненьне з Італіяй пра ўрэгуляваньне прэтэнзій, якія адносяцца да каляніяльнай эпохі. Італія пагадзілася фінансаваць буйныя праекты ў галіне мадэрнізацыі інфраструктуры, у тым ліку і аўтамагістраль уздоўж міжземнаморскага ўзьбярэжжа.

## Штотыдзень у Менску рэгіструецца 50 кішэнных крадзяжоў

У 60% выпадкаў крадуць мабільныя тэлефоны. Потым крадуць партманэты. Часьцей за ўсё крадзяжы адбываюцца ў грамадзкім транспарце, крамах, на рынках. Самыя крымінальныя гарадзкія маршруты грамадзкага транспарту — тыя, што праходзяць ля найбуйнейшых крамаў ці гандлёвых цэнтраў.

## У Беларусі ўводзяцца новыя стандарты на сокі і нэктары

З 1 верасьня сокамі называюцца толькі 100-працэнтныя сокі, г.зн. без дадатку вады. Раней стандарты дазвалялі зваць сокамі напоі з цукрам, у якім крыху меней за 50% складаў цукровы сіроп. Цяпер такія сокі будуць звацца нэктарамі.

## Віцьбіча разулі на прыпынку

Белым днём 27 жніўня на аўтобусным прыпынку «Шашэйная» на Маскоўскім праспэкце ў Віцебску маладзён зьняў і скраў у мужчыны чаравікі. Той зьвярнуўся ў міліцыю, і рабаўніка затрымалі.

## «Кастрычніцкая» адчыніцца 1 кастрычніка

Цяпер на ключавой станцыі менскага мэтро завяршаюцца пусканаладныя працы, ідзе абкатка эскалятараў. Рэканструкцыя «Кастрычніцкай» пачалася 9 чэрвеня.

## «Белавія» пачынае палёты ў Талін

Рэйсы Менск — Талін — Менск выконваюцца з 1 верасьня сумесна з авіякампаніяй Estonian Air на самалёце Saab-340. Самалёты будуць лётаць у панядзелкі, серады і пятніцы. Час вылету з Таліна — 12.55, прылёт у Менск — 14.40, час вылету зь Менску — 15.00, прылёт у Талін — 17.00.

## У Маскве ў беларуса скралі Porsche Cayenne

Аўтамабіль Porsche Cayenne 2008 году выпуску скралі ў 24-гадовага беларуса Аляксандра Ц. у расейскай сталіцы. Увечары 30 жніўня ён прыпаркаваў машыну каля дому на Мічурынскім праспэкце, а ўжо раніцай іншамарка зьнікла. Цяпер яна ў вышуку.

У Маскве ідзе сапраўднае паляваньне на Porsche Cayenne. Апошняя — няўдалая — спроба крадзяжу ў Маскве адбылася 1 жніўня. Злодзеі ня здолелі далёка ад'ехаць, бо адмысловая сыстэма заблякавала рухавік. Базавы кошт Porsche Cayenne складае 50 тысячаў эўра.

## У цыгарэтах знайшлі палёній

Брытанскія спэцыялісты выявілі ва ўнутранай дакумэнтацыі тытунёвых кампаній шакавальную інфармацыю. Аказваецца, у тытуні ўтрымліваецца радыеактыўны элемэнт палёній-210. Больш за 40 гадоў таму вытворцы тытуню спрабавалі знайсьці спосаб прыбраць небясьпечны складнік з прадукцыі, але не далі рады. З таго часу тытунёвыя кампаніі ўсімі сіламі маніліся не дапусьціць агалоскі гэтай інфармацыі.

Элемэнт палёній-210 стаў шырока вядомы ў лістападзе 2006-га, калі ім быў атручаны расейскі дысыдэнт Аляксандар Літвіненка.

## Піраты Міжземнага мора

Чатыры ўзброеныя бандыты на надзіманай лодцы каля апоўначы атакавалі 55-мэтровую яхту коштам 36 мільёнаў даляраў, што стаяла ў карсыканскім Порта Вэк'я. 10 чалавек экіпажу й 9 пасажыраў не аказалі супраціву нападнікам. Тыя забралі ў іх грошы, спустошылі сэйф і ўцяклі з больш як 180 тысячамі нарабаваных даляраў.

Цікава, што кожны з пасажыраў заплаціў за тыдзень круізу на яхце ізраільскага мільянэра Ляйтэрсдорфа суму большую за ўсё нарабаванае піратамі — па 240 тысячаў даляраў кожны.

## «Густаў» абрынуўся на ўзьбярэжжа ЗША

Ураган «Густаў», хуткасьць ветру ў цэнтры якога складае 175 км/г, выйшаў на сушу ў раёне гораду Какодры (штат Луізіяна). З узьбярэжжа Луізіяны, Тэхасу, Місісыпі і Алабамы эвакуаваныя сотні тысячаў чалавек. Амаль усе жыхары Новага Арлеану, які быў фактычна зьнішчаны ўраганам «Катрына» ў 2003 г., пакінулі горад, баючыся паўтарэньня трагедыі. «Густаў» забраў жыцьці 80 чалавек у Карыбскім моры. Значны ўрон быў нанесены Гаіці, Дамініканскай рэспубліцы і Ямайцы.

## Вучыцца чатыры дні ў тыдзень

З гэтага навучальнага году ў Францыі ўведзены чатырохдзённы навучальны тыдзень для навучэнцаў малодшых і сярэдніх клясаў. 10 мільёнаў францускіх дзетак будуць вучыцца чатыры разы на тыдзень. Гэта парадавала бацькоў, але выклікала нараканьні экспэртаў. Захады адмяняюць ранейшыя заняткі ў суботу. Апроч таго, агульнай практыкай зьяўляецца выхадны для дзяцей у сераду. Для вучняў старэйшых клясаў заняткі ў суботу захаваныя. Апроч францусаў, у Эўропе чатыры дні вучыцца невялікая колькасьць школьнікаў у Нямеччыне і Люксэмбургу.

**Паводле Cz, ул. інф., БелаПАН, МБ, BBC, Менск-навіны, БЕЛТА**


Сябры ляцелі насустрач новым прыгодам
Нішто сабе вышыня!
Але ж і холадна тут!
Гэта яшчэ што такое на гарызоньце зьявілася?
Паветраныя піраты!
Гэй вы, сьлімакі ў балёніку! Зараз мы дамо вам прачуханца!
Здавайцеся!
Каманда Капітана Танакі ніколі не здаецца!
працяг будзе...

## ВЫСТАВЫ

**Біэнале жывапісу, графікі і скульптуры**

**У Палацы мастацтва з 4 да 24 верасьня** працуе I Беларуская біэнале жывапісу, графікі і скульптуры. **Адкрыцьцё адбудзецца 4 верасьня а 16.30.** На выставе будуць паказаныя найлепшыя творы сяброў Беларускага Саюзу мастакоў за апошнія два гады.

**SILLAGE/шлейф**

**Да 11 верасьня ў фотагалерэі ZНЯТА (к-р Цэнтральны, пр. Незалежнасьці, 13)** працуе фотавыстава Сяргея Міхаленкі «Sillage/шлейф». На працягу жыцьця мы сустракаемся з рознымі людзьмі. З кімсьці бачымся толькі аднойчы, з кімсьці знаёмімся на доўгія гады. І гэтыя сустрэчы пакідаюць пасьля сябе шлейфы ўспамінаў, эмоцыяў, адчуваньняў.

**Маё вясельле**

**У кінатэатры «Перамога» (Інтэрнацыянальная, 20) да 20 верасьня** працуе фотавыстава «Маё вясельле» Славы Поталах.

**Палітра душы**

**У Музэі гісторыі беларускага кіно (Сьвярдлова, 4) да 17 верасьня** працуе выстава бісэру і батыку «Палітра душы».

**Праваслаўныя абразы Расеі, Украіны, Беларусі**

**У Мастацкім музэі да 9 лістапада** працуе выстава «Праваслаўныя абразы Расеі, Украіны, Беларусі. На ёй можна ўбачыць абразы з Трацякоўскай галерэі, Кіева-Пячорскага гісторыка-культурнага запаведніка, Мастацкага музэю Беларусі.

**Жывапіс сучасных беларускіх мастакоў**

**З 1 да 13 верасьня ў мастацкай галерэі «Ла Сандр-арт» (Раманаўская слабада, 24)** працуе выстава «Жывапіс сучасных беларускіх мастакоў».

## КАНЦЭРТЫ

**Восеньскі канцэрт**

**9 верасьня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — «Восеньскі канцэрт» **Зьмітра Вайцюшкевіча. Пачатак а 20-й.**

**Neuro Dubel**

**Тамсама 8 верасьня а 20-й** — канцэрт Neuro Dubel

**Маніфэст**

**14 верасьня ў Віцебску ў Летнім амфітэатры — «Ляпіс Трубяцкой»** прэзэнтуе праграму «Маніфэст». **Пачатак а 18-й.** Квіткі: 10 000 — 50 000.

**N.R.M**

**15 і 16 верасьня ў «Графіці»** — канцэрт N.R.M. **Пачатак а 20-й.**

**Канцэрт памяці Вашкевіча з удзелам Вайцюшкевіча, «Крамы» і «Палацу»**

19 верасьня ў КЗ «Менск» пройдзе канцэрт памяці рок-музыкі, лідэра гурту «Любоў і спорт» Андрэя Вашкевіча, якога ня стала сёлета. У канцэрце возьмуць удзел «Крама», Руся, Зьміцер Вайцюшкевіч, «Палац», «Клёндайк», Атмараві, Віталік Артыст, «Срэбнае вясельле». Сабраныя сродкі будуць перададзеныя сям'і Андрэя Вашкевіча.

# Паганства



**З 16 да 30 верасьня ў артгалерэі «Падземка» будзе працаваць выстава фатографа «НН» Андрэя Лянкевіча «Паганства». Жывучы ў хрысьціянскай традыцыі, мы не заўсёды разумеем, што яна зьявілася пасьля дваццаці тысячагодзьдзяў паганскіх вераваньняў і табу. Андрэй Лянкевіч пры дапамозе фатаграфіі паказвае паганскія традыцыі і звычаі, якія да гэтага часу існуюць у Беларусі. Адкрыцьцё выставы: 15 верасня а 18.00.**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Бабілён нашай эры»

**Бабілён нашай эры** (Babylon A.D.)

ЗША — Францыя, 2008, каляровы, 90 хв.

**Рэжысёр:** Мэт'ю Касовіц

**Ролі выконваюць:** Він Дызэль, Жэрар Дэпард'ё

**Жанр:** Постапакаліптычны баявік

**Адзнака:** 3,5 (з 10)

Дзея адбываецца ў недалёкай будучыні. Баявік Турап (Він Дызэль) мусіць перавезьці ў Нью-Ёрк дзяўчыну з кіргіскага кляштару. Але праблема нават ня толькі ў тым, што Сярэдняя Азія і Расея ахопленыя вайною і тэрарызмам. Сама дзяўчына ўяўляе імаверную пагрозу для ўсяго чалавецтва.

Француз Мэт'ю Касовіц пачынаў кар'еру, як незалежны эўрапейскі аўтар, схільны да відовішчнага жанравага кіно («Нянавісьць», «Барвовыя рэкі», «Готыка»).

Актор Він Дызэль праславіўся ролямі накачаных выратавальнікаў у фантастычных баевіках («Чорная дзірка», «Хронікі Рыдыка»).

Стужка Касовіца — высокабюджэтны ўдарны трэш зь бязладна нагрувашчанымі спэцэфэктамі, няўцямным сцэнарам і дыялёгамі — ідыятызму якіх пазайздросьцілі б на «Беларусьфільме».

Фразы дзяўчыны, якая, ні з пушчы ні з поля, ведае, як кіраваць расейскаю субмарынаю — выклікалі ў залі гістэрычны рогат замест меркаваных сьлёзаў. У нікчэмна-гратэскавых ролях — Шарлота Рэмплінг і Жэрар Дэпард'ё (гэты кашмар варта ўбачыць).

І хаця самае цікавае ў фільме — рэкламны ролік, стужку ацэняць аматары благога кіно.

**Андрэй Расінскі**

# Аршанская бітва — 2008

**ФЭСТ БЕЛАРУСКАЙ АЎТАРСКАЙ ПЕСЬНІ Й ПАЭЗІІ** «Аршанская бітва—2008» пройдзе **НА КРАПІВЕНСКІМ ПОЛІ 6 ВЕРАСЬНЯ. Фэстываль ПАЧНЕЦЦА А 18-Й** на гістарычным месцы Аршанскае бітвы 1514 году — левым беразе Дняпра пры ўпадзеньні ў яго рэчкі Крапівенкі. Праходзіць ён **НА АДКРЫТЫМ ПАВЕТРЫ**, таму варта падумаць пра адпаведную вопратку, запас ежы і намёт. Запас дроваў для вогнішча будзе на месцы.






**Даезд:**

з аўтавакзалу аўтобусам «Ворша — Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзалу проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад'ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтар», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля «Дому гандлю» (прыпынак за помнікам Леніну), можна сесьці на аўтобус ці маршрутку «Ворша — Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца фэсту каля 1 км.

# Саюзны Каўказ Беларусі і Расеі

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Калі Абхазія і Паўднёвая Асэтыя ўсё ж стануць сябрамі саюзнай дзяржавы, яны атрымаюць у кіраўніцтве структуры палову галасоў. А што, калі мы маем справу з інтрыгай падступных каўказцаў? Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Вы спытаеце мяне — чаму я, прэзыдэнт Расейскай Фэдэрацыі, сяджу ў прадбаньніку кабінэту Какойты і чаго чакаю? Справа ў тым, што Какойты вырашае — аказаць ці не Расеі вайсковую падтрымку ў вайне супраць Грузіі.

Калі казаць ляканічна — мяне кінулі як фраера.

Не, спачатку ўсё было пучком. Мы прынялі ў склад саюзу абхазаў і асэтынаў, падкарэктавалі назву структуры — Горскі Саюз Беларусі і Расеі. Капітальна пашырылі паўнамоцтвы цэнтральных саюзных органаў — адзіны ўрад, адзінае заканадаўства, адно грамадзянства.

Аблом прыйшоў нечакана. Здаецца, гэта было на саміце прэзыдэнтаў краінаў саюзу ў Сочы, дзе гаворка павінна была ісьці аб адзінай валюце. Мы ў Крамлі напярэдадні ўжо абмывалі ўвядзеньне саюзнай валюты: Менск, які доўга тармазіў справу, цяпер быў ў меншасьці.

І раптам падчас паседжаньня Ардзінба нечакана выносіць альтэрнатыўную рэзалюцыю: увесьці ў якасьці саюзнай валюты не расейскую, а абхаскую і назваць яе «саюзны вах-вах».

Натуральна, я афігеў. Аднак заблякаваць прапанову Сухумі і падтрымаўшага яго Цхінвалу ня змог. Усё таму, што падчас галасаваньня Менск устрымаўся. Беларусы разьлічвалі выцыганіць на гэтай глебе ў Масквы бонусы па коштах на пастаўку газу.

Так нечакана ў Саюзе адбыўся каўкаскі пераварот.

Далей болей: выкарыстоўваючы тую ж схему (2 галасы каўкаскіх краінаў + нэўтралітэт Менску) паўднёвыя палітыкі капітальна зьмянілі сутнасьць інтэграцыі. Забаранілі асобам славянскага паходжаньня прадаваць урук і мандарыны, загадалі ўсім грамадзянам саюзу кроўна помсьціць за родзічаў, дадаць да сваіх прозьвішчаў канчатак «ба» і «ойты» (майго прэм’ера, дарэчы, цяпер завуць Вавойты Пуцінба). Сам саюз стаў называцца Саюзны Каўказ Беларусі і Расеі са сталіцай у ауле пад назвай... забыўся, гэта маршруткай 20 хвілінаў ад Цхінвалу.

Толькі калі той аул патрабаваў ад Менску, каб БАТЭ перайменавалі на Церак-2, на Маркса 38 нарэшце зразумелі, што трэба нешта рабіць.

Аднак, каб скінуць дамінаваньне каўкасцаў, трэба была фармальная большасьць у Радзе. Я і беларускі калега, памятаю, ламалі галаву ўсю ноч — што рабіць? Лягічней за ўсё было атакаваць нейкую рэспубліку СНД і адрэзаць у іх кусок тэрыторыі на падставе прысутнасьці там грамадзянаў з расейскім пашпартамі і прыняць яе ў Саюзны Каўказ. Аднак пасьля праколу з Асэтыяй і Абхазіяй я нікому больш ня верыў — ні крымчукам, ні Тыраспалю, ні жыхарам расейскамоўнага Казахстану. Патрэбны быў вярняк.

І тут Дразды прапанавалі мне цікавы плян: назаўтра нашае МЗС абвясьціла аб прызнаньні новай дзяржавы — Злучаныя раёны Менскай вобласьці з сталіцай у Барысаве. І ўжо да канца працоўнага дня яна была прынятая ў саюзныя структуры. Натуральна, Штаты былі пратэктаратам Драздоў.

Цяпер у славянаў была зноў фармальная большасьць у кіраўніцтве саюзу. Але на гэты раз нас пракінуў Менск. Апошні хуценька знайшоў з каўкасцамі кампраміс. Беларусы захоўваюць статус кво, калі ім дадуць шэраг ільготаў: напрыклад, беларускім падлеткам можна будзе браць даведкі аб тым, што яны па стане здароўя або празь сямейную сытуацыю могуць не вывучаць прадмет «джыгітоўка» — абавязковую школьную дысцыпліну для школ усіх краінаў Саюзнага Каўказу.

Так Шаурма (новая назва Масквы) зноў аказалася ў пралёце. Усё, што ў такой сытуацыі заставалася фэдэральнаму ўраду, — абвясьціць вайну Грузіі і прайграць яе, каб Саакашвілі зноў акупаваў Абхазію і Паўднёвую Асэтыю. Чым і займаемся. Пакуль, мы пасьпяхова адступаем. Толькі б краіны Саюзнага Каўказу не аказалі нам вайсковай падтрымкі ў рамках калектыўнай дамовы бясьпекі… Што? Прабачце, мяне клічуць. Так: кінжал на месцы, папаха таксама. Барада расчасаная. Іду, іду, шаноўны Эдуард Джабеевіч!

## КАЛІ Б...

**...улады выкарысталі ноў-гаў Л.Ярмошынай, якая параўнала непразрыстыя скрынкі для галасаваньня з жанчынамі празрыстай душы, праўда, апранутымі ў строгія швэдры.**




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Прадстаўнік выбарчай камісіі:** У нас цяпер новая працэдура галасаваньня. Ідзяце ў кабінку да адной з тых апранутых у швэдры жанчын з празрыстай душой і кажаце пра свой выбар.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: «Беларускі кнігазбор»: Чачот, Каліноўскі, «Летапісы і хронікі», Баршчэўскі, Дамейка, Аляхновіч, Геніюш, Ажэшка ды іншыя, «Слуцкі збройны чын», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі» ды іншае, багаты выбар. Т.: (029) 753–70–05

**Прапануем** «Незалежная прэса»: Быкаў, Барадулін, Бураўкін, Арлоў, Кіпель, Конан, Гарэцкі, Разанаў, Брыль інш. «Гоман» розныя выпускі, сотні аўтараў, у т.л. тэксты на тарашкевіцы, літаратурная вучоба. Дапаможам падрыхтаваць тэксты розных жанраў, пераклад, віншавальныя вершы, рэдактура, выданьні. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru

**Пабачыў сьвет** чарговы нумар часопісу для грамадзкіх актывістаў «Асамблея». Агульная тэма нумару: «Стабільнасьць, альбо рэвалюцыя дабрабыту па–беларуску». Аўтары на 47 старонках разважаюць пра праблему «прафэсійнага выгараньня» актывістаў беларускіх НДА, спэцыфіку недзяржаўных арганізацыяў у варунках спажывецкага грамадзтва, посьпехі і паразы прадпрымальніцкага руху. Пабачыць часопіс можна на палічках віртуальнай бібліятэкі Камунікату (http://kamunikat.org/asambleja.html), а папяровую вэрсію замовіць праз ngo@belngo.info

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Ладзіцца вандроўка** па славутых мясьцінах паўночнай Меншчыны разам з гісторыкам Міхасём Чарняўскім. Вандроўка адбудзецца ў суботу, 6–ага верасьня. Ахвотных далучыцца просьба пісаць на e–mail: vandrouka06@tut.by

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

## Дзякуй

**Сяргею Л.** зь Берасьця.
**А.К.** з Крупскага раёну.
**Валянціне А.** з Талачынскага раёну.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Л.А.** з Гарадоцкага раёну.
**А.Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Ганьне Р.** з Валожынскага раёну.
**Т.Б.** з Магілёва.
**Аляксандру Л.** з Гомелю.
**Антону Т.** з Смалявіцкага раёну.
**Аляксандру С.** з Гродні.
**Лідзіі Л.** зь Менскага раёну.
**Уладзімеру В.** з Смургонскага раёну.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Францыі, Нямеччыне, Англіі** цяпер выдумалі людзі машыны, каб лётаць у паветры, як птушкі. І наша Вільня не адстае ад іх: гэтымі днямі неякіе паны з чыноўнікаў — Саланевіч, Кудэрскі і другія выдумалі ўжо *праўдзівых беларусаў*. Пан Саланевіч тлумачыць, што людзі, каторыя зьбіраліся пад скрыдла «Крестьянина», не праўдзівыя беларусы. Яшчэ больш фальшывымі беларусамі лічыць ён тых, што пішуць «Нашу Ніву», і гэта затым, што 1) яны — дурныя і не разумеюць справы і 2) забралі ў галаву дурную думку, што беларусы — асобная нацыя, маюць сваю мову беларускую, культуру; і «нашаніўцы» праз усё гэта скора згінуць, як дым ад ветру… Знаючы вось гэта, паны Кудэрскі, Саланевіч і др. закладаюць сваё «беларускае обчаства», каб народ не астаўся без камандзіраў і ня згінуў. А камандзіры гэтыя, як яны кажуць, павядуць народ «на началах русской государственности», лічачы яго не за беларускі, а за расейскі.

**«Наша Ніва». №19. 1908**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.09.2008.
Замова № 4832.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.